СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.21, 17.34, 11.13;
Віцебск — 6.14, 17.20, 11.06;
Магілёў — 6.10, 17.23, 11.13;
Гомель — 6.08, 17.19, 11.11;
Гродна — 6.38, 17.47, 11.09;
Брэст — 6.35, 17.51, 11.16.

МЕСЯЦ:
Першая квадра 3 кастрычніка

ІМЯНІНЫ:
Фёклы, Нікандра, Галакціёна, Уладзіслава

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

7 КАСТРЫЧНІКА 1992 г.
серада, № 200 (21978)

ВОЗГАЛАС

САЛЬДА СТАНОЎЧАЕ. АЛЕ ЯКОЙ ЦАНОЙ?

Паводле даных Камітэта па знешніх эканамічных сувязях Рэспублікі Беларусь, баланс знешняга гандлю рэспублікі, які многія гады быў адмоўным, сёння не толькі выраўнаваўся, але экспарт перавышае імпарт на 200 мільёнаў долараў. Нягледзячы на гэтую прывабную лічбу, падстаў для аптымізму няма, бо дасягнута яна не ў выніку росту аб'ёмаў рэалізацыі прадукцыі на сусветным рынку, а толькі за кошт скарачэння закупак за мяжой тавараў народнага спажывання і неабходных для народнай гаспадаркі матэрыялаў.

Загінуў не ад ран, а ад сабачага жыцця...

Праз паўстагоддзя пасля геройчнай абароны Брэсцкай крэпасці рашыўся на самагубства абаронца цытадэлі над Бугам. Былы курсант палкавой школы 44-га стрэлковага палка 2-га ўзвода Цімерэн Кабулавіч Зіматаў жыў у Сібіры, але ў апошнія гады часта прыязджаў у Брэст. Тут жа на мілай яго сэрцу зямлі кінуўся пад поезд. Як стала вядома з перадсмяротнага пісьма ветэрана, гэта быў акт пратэсту супраць дзяржаўнай палітыкі ўрада Расіі Б. Ельцына. «Калі б тады памёр ад ран, я б ведаў — загінуў за Радзіму, а вось цяпер ад сабачага жыцця. Няхай так і напішуць на магілцы...»

Работнікі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць» выканалі апошнюю волю байца гарнізона — ён пахаваны на тэрыторыі цытадэлі над Бугам.

Таццяна ГУСЕВА.
(РІД).

Эфір для апазіцыі: дамоўленасці не было

Некалькі дзён гэтая тэма не сыходзіць са старонак многіх газет: прадстаўнікі апазіцыі БНФ абвінавачваюць кіраўніцтва Міністэрства інфармацыі Беларусі і дзяржаўнай нацыянальнай тэлерадыёкампаніі ў парушэнні папярэдняй дамоўленасці аб прадастаўленні Народнаму фронту стабільнага эфірнага часу на тэлебачанні і радыё. У суботу «Звязда» змясціла думку наконт узнікшай праблемы каардынатара парламенцкай апазіцыі Сяргея Навумчыка. Сёння праясняе сітуацыю міністр інфармацыі Беларусі Анатоль Бутэвіч.

— Асабіста я не вёў ні з кім размовы аб прадастаўленні эфіру апазіцыі Вярхоўнага Савета, бо ў той час знаходзіўся ў адпачынку,— сказаў Анатоль Іванавіч.— Гэтым займаўся намеснік міністра І. Карэнда. Але сёння я ўпэўнена кажу: ніякай папярэдняй дамоўленасці аб выдзяленні пастаяннага эфірнага часу для БНФ не было. Вялася толькі размова аб тым, што трэба адпрацаваць метады і механізм выхаду ў эфір. Не больш. Мы лічым, што гэтае пытанне ўзнімаць сёння нясвоечасова. Колькасць толькі афіцыяльна зарэгістраваных палітычных партый і рухаў на Беларусі набліжаецца да дзесяці. Наша тэлебачанне мае зараз толькі 4 гадзіны арыгінальнага вяшчання ў дзень (28—у тыдзень), што вельмі мала. І калі мы станем дзяліць яго на патрэбы, скажам, Аб'яднанай дэмакратычнай партыі, Сялянскай партыі, ПКБ і г. д., то што ж атрымаецца? Яны ж таксама стануць патрабаваць для сябе эфір, і нават звароты ўжо былі. Між тым прадстаўнікі апазіцыі не раз мелі магчымасць удзельнічаць у розных перадачах на радыё і тэлебачанні і нават у прамым эфіры, гэтым пакарыстаўся ў прыватнасці і З. Пазьняк, апошні раз — напярэдадні святкавання Дня незалежнасці.

Я хачу падкрэсліць, адзначыў міністр інфармацыі Беларусі, што ў праве на эфір апазіцыі не адмоўлена. Ёсць неабходнасць стварэння дыскусійнага клуба, магчыма ў прамым эфіры, каб прадстаўнікі розных палітычных партый, рухаў мелі магчымасць прыйсці, выказаць свае меркаванні, паспрачацца. Галоўнае сёння — не дапусціць канфлікту ў грамадстве. Усе мы павінны працаваць дзеля кансалідацыі.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

У КАПЫЛІ АРЫЕНТУЮЦЦА НА «ЗВЯЗДУ»

Калі казаць шчыра, бываюць прыемныя моманты ў наш нялёгкі і супярэчлівы час і ў нас, супрацоўнікаў «Звязды». Адзін з іх меў месца ўчора. З Капыля, што на Міншчыне, патэлефанаваў рэдактар раённай газеты «Слава працы», наш даўні сябар і аўтар Іван Пракарына. Радасным голасам, поўным павагі да нас, Іван Іванавіч паведаміў, што ягоныя землякі ў гэтыя дні надзвычай актыўна і ахвотна падпісваюцца не толькі на «раёнку», а і на «Звязду». І прывёў пры гэтым лічбы, атрыманыя ў раённым агенцтве «Саюздрук» і пошце: калі зараз падпісчыкаў адзінай штодзённай беларускамоўнай рэспубліканскай газеты на Капыльшчыне 1202 чалавекі, дык на наступны, 1993 год, «Звязду» выпісалі ўжо 1366 жыхароў.

Што ж: дзякуй за давер, нашы старыя і новыя сябры! Мы вас не падвядзём!

Анатоль МЯСНІКОЎ,
рэдактар аддзела міжнацыянальных адносін і міжнароднага жыцця «Звязды».

Мал. В. ДУБОВІКА.

ГОСЦІ БЫЛІ АГРЭСІЎНЫМІ...

Адбыўся 13-ы тур другога чэмпіянату рэспублікі па футболу. Ніякіх нечаканасцей не адбылося, за выключэннем хіба што гульні ў Мінску, дзе сталічная «Беларусь» на сваім полі прэйграла дынамаўцам Брэста з лікам 1:2.

Лідэр першынства — сталічнае «Дынама» — гэты тур прапусціла. Але гэта ніяк не адбілася на яго турнірным становішчы.

Наогул, госці на гэты раз былі вельмі агрэсіўнымі і чатыры разы прымушалі гаспадароў капітуляваць. «Днепр» правёў тры безадказныя мячы ў вароты мінскіх тарпедаўцаў, «Хімік» столькі ж мячоў забіў «Лакаматыву», які здолеў толькі аднойчы паразіць вароты гасцей, а бабруйскі «Трактар» двойчы забіў «Гомсельмашу». Адзін матч удалося выйграць гаспадарам: «Шахцёр» абыграў «Металург» з лікам 1:0, а астатнія матчы закончыліся з нічыйным вынікам.

«БелАЗ» — «Тарпеда» (Мг.)—2:2.
«Будаўнік» — «КІМ» — 1:1.
«Абутнік» — «Ведрыч» — 1:1.

ДЖЭНТЛЬМЕНЫ, ЎВАГА!

БРЭСТ. (Ю. Фёдарава). У горадзе будзе адкрыты англійскі культурны цэнтр. Ён ствараецца па ініцыятыве і пры актыўным удзеле амерыканскай сям'і — мужа і жонкі Райсаў. Радаслоўныя лініі Вольгі вядуць у Брэст. Тут жылі яе продкі.

Для пачатку сям'я прывезла ў Брэст сур'ёзную бібліятэку англійскіх і амерыканскіх пісьменнікаў. Цяпер кнігі з дапамогай студэнтаў англійскага аддзялення філалагічнага факультэта Брэсцкага педінстытута класіфікуюцца і апрацоўваюцца. Ствараецца каталог будучай бібліятэкі.

БЕЛАРУСЫ— «НА ЎРА»

У горадзе Брухзаль, што на Нямеччыне, прайшоў міжнародны фестываль «Еўрапейскія музычныя сустрэчы». На гэты раз знакаміты фэст наведала шматлікая дэлегацыя з Беларусі ў саставе народнага ансамбля танца «Праліска» Гродзенскага вытворчага прадзільна-нітачнага аб'яднання і хору Мінскага мастацкага вучылішча. Праграма нашых выканаўцаў сярод гаспадароў і гасцей фестывалю прайшла «на ўра».

АБО «ЗВЯЗДА», АБО «ПАГОНЯ»?

Незвычайны і даволі дзіўны пратэст разгледзеў пазаўчора Мінскі гарадскі суд.

Мінчанін Аляксандр Бартановіч патрабаваў, каб гарадская феміда апратэставала рашэнне нарсуда Савецкага раёна сталіцы, які адмовіўся прыняць яго іскавую заяву да газеты «Звязда».

А сутнасць прэтэнзіі пана Бартановіча да старэйшай беларускай газеты такая. На думку істца, газета павінна неадкладна зняць са сваёй «шапкі» герб «Пагоня», паколькі гэтая сімволіка, што выкарыстоўвалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны здраднікамі Радзімы, быццам бы апаганьвае памяць мінскіх падпольшчыкаў, якія выдавалі і распаўсюджвалі «Звязду». «А калі калектыву рэдакцыі такая дарагая «Пагоня», то няхай ён памяняе назву газеты», — заявіў у тэлефоннай размове з карэспандэнтам Аляксандр Бартановіч. Зрэшты, гарадскі суд пакінуў без змянення рашэнне сваіх калег.

Мікалай ДЗЯБЕЛА.

ДПА ПАВЕДАМЛЯЕ

Германскае інфармацыйнае агенцтва ДПА не мае патрэбы ў асаблівай рэкламе. Яе інфармацыі ў галіне палітыкі, эканомікі, сацыяльнай сферы, правоў чалавека, спорту і навукі шырока скарыстоўваюцца самымі рознымі тэле- і радыёкампаніямі, а таксама суседна вядомымі газетамі. Тым больш, нам прыемна ўсведамляць, што агенцтва ДПА згадзілася пастаўляць сваю інфармацыю для «Звязды» бясплатна, з павагай і разуменнем ставячыся да старэйшай беларускай газеты.

УСХОД ПАВІНЕН ПАДЦЯГВАЦЦА

Толькі працяглая фінансавая падтрымка можа ўратаваць былую адміністратыўную эканамічную сістэму Усходняй Германіі. Да 2000 года апошняя павінна атрымаць ад Заходняй Германіі 140 біліёнаў марак. Як заявіў канцлер Коль, гэта дапамога будзе пашырацца, але «усходнія палітыкі і эканамісты павінны самі шукаць шляхі аптымальнага развіцця сваёй эканомікі».

А ЯПОНЦЫ НЕ АДМОВІЛІСЯ

У той час, як на многіх нашых прадпрыемствах адмовіліся ад вытворчай гімнастыкі, японскія фірмы актыўна ўкараняюць яе у вытворчасць. У прыватнасці, 70 тысяч працоўных вядомай фірмы «Ляцусіта Электрык Індастрыял» кожны дзень пачынаюць з 20-хвіліннага фізічнага рытуала, па-нашаму вольных практыкаванняў. Свае поспехі фірма тлумачыць і гэтым своеасаблівым усеагульным трэнінгам.

ПАТРАБАВАННІ ЗАДАВОЛЕНЫ

Адміністрацыя Мінскага трактарнага завода, азнаёміўшыся з патрабаваннямі прафсаюзнага камітэта прадпрыемства, прыняла пастанову аб павышэнні заработнай платы ўсім работнікам беларускага трактарабудаўнічага аб'яднання. З 1 кастрычніка тут павялічаны тарыфныя стаўкі і аклады ў сярэднім на 30 працэнтаў. Акрамя таго, павялічаны выплаты на абеды, якія цяпер складаюць 20 рублёў за кожны рабочы дзень.

Алег ПРАЦЬКО.

С. ШУШКЕВІЧ у час сустрэчы з выбаршчыкамі:

Пра апарат, які «пухне», мазгі, якім лепш праветрывацца, чым гніць, увогуле — пра наша жыццё

Пазаўчора Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі С. Шушкевіч сустрэўся са сваімі выбаршчыкамі з мінскага акцыянернага таварыства «Амкадор», якое таксама вядома як аб'яднанне «Дармаш».

У невялікім выступленні ён коратка ахарактарызаваў палітычную і эканамічную абстаноўку на Беларусі. У прыватнасці, закранаючы актуальнае цяпер **пытанне рэферэндуму**, ён адзначыў, што праводзіць яго неабходна, інакш гэта будзе парушэннем дэмакратыі. Але які характар павінны мець яго вынікі — дарадчы ці абавязковы? Не менш надзённае пытанне, што датычыць так званай **адзінай рублёвай зоны**. Логіка падзей такая, што нас як бы падштурхоўваюць да ўвядзення ўласнай валюты. Падкрэслівалася таксама: кажуць, цяпер жыць стала горш, але назад шляху няма. Гэта значыць, мы не адступімся ад рэфармавання эканомікі і ўсяго нашага жыцця, і такі дзяржаўны аптымізм, вядома, імпануе.

А потым былі самыя разнастайныя пытанні, якія ўвогуле датычылі нашага штодзённага жыцця. Прычым, думаецца, выбаршчыкі атрымалі даволі шчырыя адказы на іх. Самі ж пытанні можна раздзяліць на тры групы: сацыяльна-эканамічнага характару, якія, напэўна, пераважалі; палітычнага і на вайсковую тэматыку. Ужо першае з іх несла на сабе адбітак нашага сённяшняга неспакойнага жыцця: янё датычыла вырашэння **праблемы забеспячэння бензінам і цэн на яго**. С. Шушкевіч, у прыватнасці, зазначыў, што асабіста ён здзіўляецца, чаму яшчэ не павысілі цэны на бензін у нас, калі ўсе вакол павышаюць? Ад гэтага рэспубліка ў цэлым толькі страчае. І сапраўды, учарашнія партнёры па Саюзу, якія, па сутнасці, вядуць эканамічную вайну паміж сабой, менш за ўсё дбаюць пра «бліжніх».

Прагучала пытанне, **ці будуць цэны ўвогуле пад кантролем, яны ж пастаянна растуць?**.. Не ведаю, наколькі задаволіў аўтара пытання адказ наконт залежнасці цаны ад затрат, попыту і прапановы, але перакананы, што з падобнымі пытаннямі ў рынак ісці нельга. Варта памятаць, што менавіта свабодай цаны вызначаецца свабода вытворцы. Кантроль над ёй — гэта кантроль і над ім. Іншая справа: у нас не задзейнічаны ўсе атрыбуты рынку, вось таму цэны і маюць цяпер толькі адну ўласцівасць, якая, вядома ж, не даспадобы нам, — павышацца. Кантроль над цаной і манаполія ў любой форме — гэта не лепшае выйсце, што, дарэчы, паказвае і цяперашняя сітуацыя з айчыннымі тытунёвымі вырабамі — яны проста зніклі. Між іншым, спікер беларускага парламента зазначыў наконт нядаўняга адпаведнага рашэння ўрада, што яно неадназначнае. Ну, а што рабіць цяпер курцам? Хіба што сапраўды прыслухацца да парады кінуць курыць...

Ізноў паўстала пытанне наконт «рубля». Адказ: нам у такім выпадку будзе цяжка. Але мы не змірымся і з тым, калі рублёвая зона будзе фікцыяй.

Як забяспечыць сябе ўласнымі энергарэсурсамі? Ці будуць у нас свае вугаль і нафта?

Праводзіцца разведка, пры гэтым на свой вугаль разлічваць, відаць, не трэба, яго зусім мала. Наш выхад, няйначай, усё ж у ядзернай энергетыцы. «Я буду несумленным чалавекам, — ужо далей зазначыў С. Шушкевіч, — калі скажу, што мы можам без яе абысціся. Хоць жах ад яе — вялікі...»

Чаму недастатковыя меры па абароне спажывецкага рынку? Куды нам ісці — на Захад ці на Усход?..

Падобныя меры існуюць, хоць і не ўсё тут без праблем. Але найбольш важна захоўваць ва ўсім разумны баланс, прымяняць тыя ж меры ў спалучэнні з мытным кантролем і мытным падаткам.

Гэтак жа разумна, памяркоўна ставіцца і да таго, куды нам ісці. Не трэба процістаўляць Захад і Усход, Поўнач і Поўдзень, не варта ў гэтых адносінах размяркоўваць прыярытэты.

Між іншым трэба тут дадаць: імкненне «заходнікаў» зразумелае, але, напэўна, найперш трэба думаць аб тым, з чым канкрэтна ісці нам на Захад, з якой прадукцыяй. Думаецца, што яшчэ вельмі доўгі час, а можа і пастаянна, наш асноўны рынак будзе на Усходзе — хочацца гэтага каму ці не.

Чаму не ўздымаецца сельская гаспадарка? Адносіны да калгасаў?

Ніхто не можа палепшыць становішча вяскоўцаў, акрамя іх саміх, дзяржава павінна толькі стварыць для гэтага адпаведныя ўмовы. Увогуле ж, у вёсцы — ажыўленне, проста не ўсе праблемы (гэта ў першую чаргу датычыць запушчанасці быту, дарог) адразу вырашаюцца.

Адносіны да калгаса? Становішча, і найперш да іх працаўнікоў. Хто яшчэ так шмат і так напружана працаваў і так мала меў? Ніякай пагрозы калгасам няма. Але няма і ніякай санацыі калгасаў, няма ніякага банкрутства, ніводзін не разваліўся — хоць у многіх з іх справы ідуць дрэнна, аднак усіх падтрымліваюць. Увогуле ж, павінен быць плюралізм розных формаў гаспадарання, якога па сутнасці таксама няма.

Адносіны да БНФ?

Што датычыць станаўлення беларускасці, нацыянальнай самасвядомасці — заслугі БНФ у гэтай справе неаспрэчныя. Але праяўляецца і неабалышэвісцкі падыход. Можа, гэта не лінія БНФ, а яго кіраўніцтва?

Спікер парламента таксама не пагадзіўся з тым, што, маўляў, акрамя БНФ, няма каму і думаць, і працаваць па-дзяржаўнаму.

Ці задавальняе сучасны Саўмін?

Не. Непакоіць, што ствараюцца шматлікія ўладныя структуры, апарат «пухне» (між іншым, мы становімся сведкамі сапраўды нежартоўнага разбухання апарату нашай выканаўчай улады, што кладзецца цяжкім грузам на бюджэт, на ўсіх нас. Хоць пастаянна гаворыцца наконт скарачэння і эканоміі сродкаў)...

Знаходжанне ў нас расійскіх войск, калі яны будуць выведзены? Чаму, які працэнт **войск з краін Усходняй Еўропы** выводзіцца ў Беларусь? Пры гэтым ваеннаслужачым трэба потым плаціць пенсіі..

Ёсць дамоўленасць, што войскі з тэрыторыі Беларусі будуць выведзены на працягу 7 гадоў. Аднак гэта крайні тэрмін. С. Шушкевіч спадзяецца, што будзе прынята пагадненне наконт іх выводу да пачатку 1995 года. У Беларусь жа выводзяцца тыя ваеннаслужачыя, для якіх ужо будуюцца ваенныя гарадкі.

Пенсіі ваеннаслужачым будзем плаціць, яны сваё аддалі.

Мы маглі б дэнансаваць адпаведныя пагадненні, якія былі заключаны ў той час, калі існаваў Саюз. Але выклічам абурэнне тых жа ваеннаслужачых, ускладнім адносіны з Германіяй, паставім сябе ў нязручнае становішча ў міжнародным плане. Ці варта гэта рабіць?

А яшчэ было шмат іншых пытанняў, «вялікіх» і «малых». Наконт адносін да нашых суайчыннікаў за мяжой і сувязей з імі, выезду з Беларусі «мазгоў», якім, дарэчы, лепш праветрыцца, чым гніць у нас (вядома, калі яны не знаходзяць сабе прымянення), і наконт затрымкі ацяпляльнага сезона. Гаварылася на сустрэчы і аб нелюбімых многімі з нас гандлярах, але менавіта «гандаль рухае эканоміку», аб значным расслаенні ў грамадстве па даходах, але мы павінны ўсвядоміць, што цяпер ранейшай роўнасці не будзе. Іншая справа: трэба адрозніваць, калі чалавек будуе свой дабрабыт, дзякуючы таленту, а калі — дзякуючы махінацыям, і яго трэба адпраўляць да пракурора...

У заключэнне Старшыня беларускага парламента зазначыў, што ён чакаў рэзкіх выпадаў у свой адрас і здзіўлены той цярпімасцю, якая была праяўлена...

Што ж, значыць, нягледзячы на цяжкасці, яшчэ існуе крыху даверу ў людзей да нашых уладных структур. Толькі ж запас яго, відаць, невялікі. Гэта трэба ўлічваць і таму ж парламенту, і яго Старшыні ў іх далейшай дзейнасці.

Кар. «Звязды».

У ЗОНЕ АДБУДУЦЦА ЗМЕНЫ

Шэсць з палавінай гадоў ідзе нябачная вайна паміж рознымі навуковымі школамі, медыкамі, міністрамі, палітыкамі. Пункты гледжання на тое, што можна і чаго нельга ў чарнобыльскай зоне, нярэдка настолькі палярныя, што ў радавых жыхароў гэтых месц галава ідзе кругам. І тым не менш, яны тут жывуць, вырошчваюць збожжа, пасуць жывёлу і, што самае галоўнае, — працягваюць род чалавечы. Аднак якім будзе гэты род наш нават не праз стагоддзі, а ўсяго толькі праз дзесяцігоддзі, — сёння не можа сказаць ніхто.

Міністр аховы здароўя рэспублікі Васіль Казакоў

(Заканчэнне на 3-й стар.).

СПЕЦЫЯЛЬНА ДЛЯ «ЗВЯЗДЫ»

«Пакуль не падымем агульны ўзровень развіцця, нічога не атрымаецца»

Гутарка з начальнікам Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Георгіем ТРАЯНАМ

— Георгій Іванавіч, пасля заметкі агенцтва «БЕЛІНФАРМ» «Між іншым», надрукаванай нядаўна ў «Звяздзе», у рэдакцыю прыйшло шмат лістоў з пытаннямі, якія датычаць канчатковага статуса санаторыя «Беларусь» у Юрмале, амаль адзінага беларускага санаторыя за мяжой. Ці паставіла ваша ўпраўленне апошнюю кропку ў гэтай справе?

— Санаторый наш, і ніякіх спрэчак тут быць не можа. Аб гэтым сказаў і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Латвіі ў Беларусі, які днямі быў у мяне на прыёме. Іншая справа, ці зможам мы яго ўтрымліваць далей. У той жа Латвіі пакуль засталіся «жывымі» толькі наш і расійскія санаторыі. Усе астатнія рэспублікі прадалі свае яшчэ два гады назад. Утрыманне санаторыяў — вельмі дарагая рэч, асабліва ў сённяшніх умовах. У Расіі рэнтабельны санаторый прапаноўвае свае паслугі аднаму чалавеку за 65 тысяч рублёў на 24 дні. Ці маем мы права ўстанаўліваць такія цэны? Справа ўскладняецца яшчэ і тым, што ўжо цяпер за дзесяць рублёў даюць у Латвіі толькі 7 латаў, а абяцаюць абменьваць 48 да аднаго!

Амаль тая ж сітуацыя і з нашым другім санаторыем «Місхор» у Сочы.

— Наколькі мне вядома, у ваша падпарадкаванне, акрамя санаторыяў, уваходзяць і ўсе тры нашы запаведнікі рэспубліканскага значэння. Тут таксама тая ж няпростая сітуацыя?

— Зусім нядаўна па даручэнню Старшыні Савета Міністраў РБ В. Кебіча пабываў у Злучаных Штатах Амерыкі і прывёз грант на 1 мільён долараў, які выдзеліў нам Сусветны банк развіцця і рэканструкцыі. Гэта не крэдыт, а грошы, якія будуць бесзваротна ўкладвацца ў даследчую праграму менавіта трох нашых асноўных запаведнікаў: 800 тысяч долараў пойдзе на Белавежскую пушчу, па 100 тысяч — на Бярэзінскі і Прыпяцкі запаведнікі.

Мы аднымі з першых атрымалі грошы, на якія, безумоўна, была вялікая канкурэнцыя. І на тры з палавінай месяцы раней, чым трэба было, пад кіраўніцтвам А. Максімовіча распрацавалі праект гранта. А ўвогуле над распрацоўкай праграмы, пад якую выдзелены замежныя інвестыцыі, будуць працаваць каля трыццаці нашых інстытутаў. Ствараецца спецыяльнае бюро праекта са спецыялістаў самага высокага класа для кантролю за навуковымі распрацоўкамі. Калі здолеем выканаць пастаўленыя Сусветным банкам развіцця і рэканструкцыі ўмовы — да мая наступнага года справіцца з палавінай тэм, — то нам выдзеляць яшчэ дзесяць мільёнаў долараў.

Ну, а ўжо выдзеленыя грошы, безумоўна, паслужаць добрай падтрымкай для развіцця матэрыяльна - тэхнічнай базы запаведнікаў: закупкі патрэбнага абсталявання, тэхнікі для аналізаў, ды і будучых навуковых праграм, сапраўды ўнікальных і патрэбных. Дарэчы, 100 тысяч долараў ідзе на вывучэнне ўплыву радыяцыі на наваколь нае асяроддзе.

— І ўсё ж доларавыя ўкладанні, напэўна, не здымаюць усіх праблем?

— А мы гэта выдатна разумеем. Наадварот, узрастае адказнасць за наш нацыянальны гонар. Калі два гады назад у

(Заканчэнне на 2-й стар.).

У Вільню, да Зоські Верас

2 кастрычніка ў Віленскім педуніверсітэце адбылося святкаванне стогадовага юбілею Людвікі Антонаўны Войцік (Зоські Верас) — вядомай беларускай пісьменніцы і грамадскай дзяячкі, якая большую частку свайго жыцця пражыла ў Вільні. Арганізавалі яго і прынялі ўдзел у чытаннях прадстаўнікі Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», Скарынаўскага культурна-асветнага цэнтра, Асацыяцыі беларусістаў Літвы, кафедры беларусазнаўства факультэта славістыкі Віленскага педагагічнага ўніверсітэта, беларускіх суполак у Вільні.

Многія беларускія даследчыкі і пісьменнікі, падобна А. Мальдзісу, даўно, у самыя неспрыяльныя для нацыянальнай працы часы, ведалі, што недзе ў лесе пад Вільняй ёсць невялікая хатка, што ў яе вокнах гарыць агеньчык, што ў хатку гэтую можна зайсці са сваімі клопатамі, праблемамі і атрымаць параду, дапамогу. Той хаткі ў Ніжніх Панарах ужо няма — згарэла вясной 1990-га. А год таму назад памерла і яе гаспадыня Зоська Верас... Неяк не пакідае здзіўленне ад незвычайнага супадзення — стогадовы юбілей і гадавіна смерці...

Але незвычайнай была і сама Зоська Верас, яе лёс, праца. Яе няма, але беларусы па-ранейшаму едуць у Вільню, на яе магілу. Прыехалі на могілкі ў Верхніх Панарах у той дзень і мінскія госці, і віленскія беларусы, і прадстаўнікі літоўскай большасці Вільні — пакланіцца, ускласці кветкі, сказаць колькі добрых слоў пра бабулю Зоську.

У дакладах і ўспамінах Лявона Луцкевіча, Адама Мальдзіса, Алеся Бяляцкага і іншых неаднаразова гучала, што З. Верас заўсёды была вельмі заклапочана лёсам беларушчыны ў Вільні, станам беларуска-літоўскіх нацыянальных адносін, ад якіх і цяпер залежыць лёс беларускай прысутнасці ў старажытнай сталіцы ВКЛ, пераемнасць традыцый і перспектывы. Ішла размова і пра надзённыя справы беларусаў Літвы: аднаўленне Віленскага беларускага музея, экспанаты якога па-ранейшаму захоўваюцца ў розных архівах, экспазіцыях і запасніках іншых музеяў літоўскай сталіцы; стварэнне беларускай гімназіі ў Вільні; абмен літаратурай; пра сітуацыю ў галіне перакладу (апошняя беларуская кніга на літоўскай мове выйшла яшчэ ў 1990 годзе). Старшыня Літоўскай асацыяцыі беларусістаў Альма Лапінскене скардзілася на змену назваў «Літва» на «Летува», «літовец» на «летувіс», што ўкараняюць апошнім часам «ЛіМ» і «Наша ніва», а літоўцы ўспрымаюць як крыўду і непаразуменне. Гучалі таксама заклікі стварыць умовы для нацыянальнага жыцця літоўцаў у Беларусі хоць бы на тым узроўні, якім забяспечаны віленскія беларусы.

Такім чынам, стогадовы юбілей Зоські Верас стаў добрай падставай для сур'ёзнай размовы аб праблемах літоўска-беларускіх адносін, для пошуку ўзаемазбліжэння. **З гэтай нагоды і наша газета прапануе ўвазе чытачоў падборку матэрыялаў па вышэйакрэсленай тэматыцы пад рубрыкай «Сумежжа» на 2-й старонцы «Звязды».**

Валер КАЛІНОЎСКІ.

Нёман у небяспецы

180 тон мазуты, выпушчанай былым работнікам аб'яднання «Мастоўдрэў»з нікім не ахоўваемага сховішча, залілі тэрыторыю прадпрыемства і праз ліўневую каналізацыю трапілі ў Нёман. Спачатку пляму спрабавалі лакалізаваць сваімі сіламі. Толькі праз некалькі дзён, калі яна дайшла да Гродна, звярнуліся за дапамогай да ваенных.

— Інфармацыя аб здарэнні паступіла да нас у шаснаццаць гадзін, — расказвае камандзір палка пантанёраў палкоўнік Пётр Клішкоў. — А ў дзевятнаццаць ля вёскі Мігава ўжо стаяў пантонны мост.

Гэты мост, забіты цюкамі саломы, і стаў фільтрам для мазуты. І яшчэ ў адным пункце дакладна спрацавалі воіны. Быў перакрыты водазабор, з якога паступае шэсцьдзесят працэнтаў вады для патрэб Гродна.

А як у гэтай надзвычайнай сітуацыі дзейнічалі грамадзянскія службы? На пераправе знаходзіўся толькі сумуючы вадзіцель асенізатарнай машыны Валерый Занчукоўскі. На работу яго адправілі без бензіну. Давялося ваенным заправляць яго машыну. А к вечару вадзіцель, махнуўшы на ўсё рукой, сказаў: «Я адзін увесь Нёман не вычарпаю». І паехаў...

— Адносіны да здарэння ў мясцовых улад абыякавыя, — сцвярджае палкоўнік Клішкоў. — Сабраць жа мазуту цяпер вельмі складана. Узровень вады ў Нёмане падае, і чорная жыжка асядае на берагах. Ствараецца ўражанне, што гэта мала каго трывожыць. Відаць, нічому не навучыў нас Чарнобыль. Усё спадзяёмся на ўдачу.

Між тым у небе над месцам аварыі баражыраваў верталёт з Літвы. Суседзі спалохаліся: іх Нямунас у небяспецы.

НА ЗДЫМКУ: воіны-пантанёры за работай.
Фота Аляксандра ТАЛОЧКІ.
(БЕЛІНФАРМ).

Літоўцы і Беларусы. Праблематыка адносін

СУМЕЖЖА

Гэтыя дзіўныя людзі, што жывуць на Поўдні,

або Ці могуць ў бацькі быць два блудныя сыны?

Юры ШАЎЦОЎ, гісторык, супрацоўнік АН Літвы

Літва — дзіўная краіна. З якога боку мы не падышлі б да яе, мы будзем здзіўлены яе ўнікальнасцю: і вельмі аднародная ў нацыянальным складзе, і амаль суцэльна каталіцкая, і з арыгінальнай гістарычнай самасвядомасцю, і з мовай, якая амаль не мае роднасных... Адным з яе феноменаў нам абавязкова здасца факт, што ледзь ці не кожны літовец скажа вам у размове пра сваіх суседзяў, што літоўцы і беларусы — гэта адзін народ, які размаўляе на розных мовах, а сярод «свядомых» беларусаў вы не раз пачуеце, што літоўцаў не існуе, ёсць «жмудзіны», а «астатнія» — гэта тыя ж беларусы, толькі размаўляюць «па-свойму», і наогул, назва народа — беларусы — гэта няўдалая выдумка аднаго паэта, больш правільна сказаць, што мы ўсе — «літвіны», «літоўцы». Самае ж дзіўнае, што ў гэтыя словы будзе ўкладзены адзін сэнс: і літоўцы, і беларусы—гэта народы, якія выйшлі з адной культуры, што склалася ў адной дзяржаве, — у Вялікім княстве Літоўскім.

Гэта так непрывычна чуць у постсавецкую і постюгаслаўскую эпоху ў адносінах да двух суседніх народаў, што літоўцы не могуць хоць бы ледзь-ледзь не зацікавіцца беларусамі, асабліва тымі, што жывуць у Літве: што гэта за людзі і як з такой нацыянальнай самасвядомасцю яны ўжываюцца тут?

Па-першае, ядрэнна ў цэлым жывуць, прынамсі, з Літвы асабліва яе выязджаюць, супраць яе незалежнасці не выступаюць, наадварот, у час абодвух пераваротаў яны рашуча падтрымалі Літву, а на працягу трох гадоў, пакуль урад БССР з падачы Масквы прад'яўляў тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Літоўскай Рэспублікі на Вільню, усе беларускія арганізацыі ў Літве былі супраць гэтага, у адрозненне, напрыклад, ад польскіх.

Па-другое, віленская беларуская абшчына — унікальная для Беларусі. Гэта адзінае месца, дзе захавалася пераемнасць традыцыі беларускага нацыянальнага руху, толькі тут здолелі выжыць пасля ўсіх праследаванняў рэпрэсій некалькі дзесяткаў пажылых людзей, якія памятаюць яшчэ даваенную і дарэвалюцыйную «беларушчыну», якія нават ведалі Янку Купалу і Антона Луцкевіча, што захавалі цесныя сувязі з беларускай эміграцыяй ва ўсім свеце. Таму значэнне самога факта існавання гэтай абшчыны для ўсёй Беларусі вельмі і вельмі вялікае. Апрача таго, Беларусь — не Літва. Там няма такой нацыянальнай кансалідацыі і нават гістарычная памяць народа ў сваёй масе скажоная савецкай «апрацоўкай», таму для беларускай нацыянальнай культуры важны кожны чалавек, які ўсвядоміў сябе беларусам, а тут захавалася «маленькая Галіцыя» Беларусі ды яшчэ ў сэрцы такога блізкага беларусам народа. Усе апошнія дзесяцігоддзі «падпольныя» беларусы ездзілі ў Вільнюс проста пахадзіць па яго вуліцах, пасядзець у яго кавярнях, паглядзець на яго храмы, каб яшчэ раз зразумець, кім бы яны маглі быць нават пры Саветах, калі б здолелі згуртавацца, як літоўцы. Літва была для нацыянальнай Беларусі не проста акном на Захад, але і ў саміх сябе, а віленскія беларусы — адным з тых некалькіх цэнтраў, дзе генераваліся ідэі, якія прывялі ціпер да ўзнікнення на поўдні ад Літвы незалежнай рэспублікі, цэнтрам, які заўсёды стаяў на галаву вышэй за іншых па ўзроўню духоўнасці і цывілізаванасці.

І гэта не страшна. Яшчэ ў канцы XIX стагоддзя «беларускасць» у асноўным канцэнтравалася тут, у Вільні. Тут выходзіла галоўная беларуская газета «Наша Ніва», былі беларускія школы, а пры Польшчы — гімназія, базіраваліся палітычныя арганізацыі. Нават ў аснову беларускай літаратурнай мовы ляглі віленскія сельскія гаворкі. (Віленскі край да гэтага часу заселены людзьмі, якія размаўляюць у асноўным на беларускім дыялекце). Толькі пасля апошняй вайны страшныя рэпрэсіі МДБ амаль цалкам знішчылі гэтую «беларускую Галіцыю», як у свой час загінула і літоўская Малая Літва. Значэнне ціперашняй віленскай беларускай абшчыны для Беларусі і блізка не роўнае таму, што было... І ўсё ж не дзіўна, што нават асколкі ранейшага сонейка свецяць яркцэй, чым маладыя неспрактыкаваныя зорачкі ў сучаснай Беларусі.

У беларусаў Літвы шмат праблем. Аднак жывуць яны не дробязямі непаразуменняў з дзяржаўнымі чыноўнікамі або невукамі. Беларусы Літвы — дома. Яны карэнныя жыхары Віленскага краю і глядзяць на Літву спакойна і па-сямейнаму. З іх пункту гледжання Літва — гэта як бы ўзмоцненая правінцыя Вялікага княства, якая прэтэндуе на дамінаванне ва ўсёй дзяржаве. Ім і смешна, а іншы раз яны бываюць раздражнёнымі, але па вялікім рахунку разумеюць, што менавіта гэтая правінцыя выратавала дух Вялікага княства, калі большая частка яго прасторы была захоплена ворагамі. Дык ці могуць яны мець сур'ёзныя прэтэнзіі да Літвы за правінцыяльную, на іх думку, інтэрпрэтацыю некаторых гістарычных фактаў?

Чытачу, магчыма, гэта ўсё здасца дзіўным: месіянская свядомасць на парозе XXI стагоддзя ў цэнтры Еўропы? Сапраўды, гэта дзіўна, але чым, як не гэтым, растлумачыць падтрымку літоўскімі беларусамі незалежнай Літвы, адмову ад выключна рэальнай магчымасці далучэння з дапамогай савецкіх танкаў і Польшчы Вільнюса да Беларусі і адмову беларусаў Літвы ўсур'ёз падымаць пытанне аб ушчамленні іх правоў у Літве, як рускія або палякі (можна ж было б знайсці і такія факты)?

Беларусы ў Літве дома. Яны проста лічаць сябе большымі літоўцамі, чым самі літоўцы. І Літва, якая атрымала з Вільнюсам яшчэ і іх, нечакана набыла магчымасць развітацца з адзінотай маленькай нацыі. Гэта непрывычна: два блудныя сыны ці, можа, сіроты пасля забітых ворагам бацькоў, сустрэліся пасля многіх гадоў разлукі на родным двары і пазналі адзін аднаго. Раней так узнікала вёска. Гледзячы на здзейсненыя ў апошнія гады ўчынкі ў адносінах адзін да аднаго літоўцаў і беларусаў, здаецца, можна быць упэўненым, што яна ўзнікне і тут.

НА ЗДЫМКУ: Літоўскі фальклорны гурт ля сцен Ніжняга замку ў Вільні.

ДУМКА ЖУРНАЛІСТА

«Мы—гуды з братняй Жмуддзю...»

Калі пасля сёлетняга візіту ў Мінск Вітаўтаса Ландсбергіса пайшла пагалоска, што нашу дзяржаву літоўцы цяпер будуць называць «Гудзіяс Рэспублікас», а беларусаў гудамі (замест ранейшага «балтарусы»), для вельмі многіх гэта было дзікім і незразумелым. І хоць некаторыя адгукнуліся на гэта: «А мы іх будзем зваць «жмудзінамі», а нейкі В. Кулік у «Чырвонай змене» нават напісаў вясёлую фразу: «Мы—гуды з братняй Жмуддзю»—на манер першага радка не змененага яшчэ з камуністычных часоў беларускага Дзяржаўнага гімна,— гэта сведчыць аб элементарным няведанні ў нашым грамадстве гісторыі беларуска-літоўскіх адносін. Яно і зразумела: а якія мы мелі кантакты з Літвою, апрача фіктыўнага сацыялістычнага спаборніцтва рэспублік ды вядомай пастановы кіраўніцтва БССР аб тэрытарыяльных прэтэнзіях да Літвы?

Цяпер жа сваёй агульнай гісторыяй, дзяржаўным суседствам мы вымушаны шукаць кантакты, наладжваць адносіны і, шчыра прызнаемся, многаму вучыцца ў іх, пераймаць вопыт усталявання нацыянальнага жыцця. Не трэба баяцца, што літоўцы ператвораца для нас у чарговага «старэйшага брата»—іх замала для гэтага, ды і не бачаць яны сябе ў гэтай непрывабнай ролі. Наадварот, разам з літоўцамі, па-мойму, лягчэй будзе ратавацца ад «любові» і «гарачых абдымкаў» сапраўдных «старэйшых братоў».

А пакуль што мы павінны прызнаць, што тыя стасункі з літоўцамі, якія мы маем, не могуць задавальняць нас, мы павінны іх пашыраць.

Думкі, выказаныя сёння рознымі людзьмі, не могуць лічыцца ісцінай, яны суб'ектыўныя, тэндэнцыйныя, спрэчныя, што ўласціва кожнаму чалавеку. Давайце ж палемізаваць, прапаноўваць свае аргументы, але толькі (галоўнае) перастанем заплюшчваць вочы на свайго паўночна-заходняга суседа, усвядомім, што гэта таксама жыццёва неабходны партнёр нашай дзяржавы.

Валер КАЛІНОЎСКІ.
(Тэлефон: 32-38-01).

ЛІТОЎЦЫ ВЫРАЗНА БАЧАЦЬ РОЗНІЦУ

Генадзь САГАНОВІЧ, супрацоўнік Інстытута гісторыі АН Беларусі

Выказванні майго калегі Юрыя Шаўцова я ўспрымаю зусім нармальна, разумеючы яго права на суб'ектыўную думку, але ў нечым я і паспрачаўся б з ім, бо на нейкія пытанні я гляджу інакш і не прымаю тут ніякай эйфарыі, штучнай гераізацыі.

Літоўскае грамадства даволі закрытае. Мне даводзілася абмяркоўваць тэму літоўска-беларускіх стасункаў з тамтэйшымі гісторыкамі, і мне здалося, што ў іх якраз вельмі выразнае бачанне розніцы паміж нашымі народамі і нашага месца як ніжэйшага адносна літоўцаў. Можа, вопыт Шаўцова дазваляе яму мець уяўленне зусім іншае — гэта магчыма. Толькі я запытаў бы, ці не даводзілася яму чуць, як літоўскія школьнікі смяюцца над беларускімі на спаборніцтвах, алімпіядах ці яшчэ дзе... Гэта негатыўныя бакі нашых адносін. Канешне, яны ёсць, як ёсць і пазітыўныя.

Згодны, што Вільня была беларускай Галіцыяй, але, па-мойму, літоўцы глядзяць на тых беларусаў, што едуць цяпер жыць у Вільню, не так прыязна, як гэта можа падацца Шаўцову. Калі б я памяняў кватэру і апынуўся ў сталіцы суверэннай Літвы, дык мяркую, што нават мае літоўскія сябры перасталі б быць шчырымі і прыязнымі, як цяпер. Мы можам сябраваць толькі на дыстанцыі. Бо калі прыеду я, потым яшчэ і яшчэ нехта ў іх сталіцу, — то яны гэта будуць разглядаць ледзьве не як замах на суверэнітэт. Гэта складаная праблема. Нашы адносіны з-за гэтага даўно нацягнутыя. Людзі памятаюць, як не так даўно яны забралі гэтую Вільню і злітуанізавалі яе за два пакаленні... Але падкрэслю, што і я, як любы іншы чалавек, не пазбаўлены суб'ектывізму.

Што ж увогуле датычыць беларуска-літоўскіх адносін, то я рызыкну сказаць, што на ўзроўні навуковым іх практычна няма. Па розных прычынах. У тым ліку з-за самазацятасці літоўцаў і, магчыма, апраўданага жадання не мець такіх стасункаў з намі, бо мы знаходзімся на розных этапах развіцця. Шмат у чым мы сапраўды не дараслі да літоўскай нацыі — гэта трэба прызнаць шчыра. Прынамсі, калі гаварыць пра вывучэнне гісторыі сярэдневякоўя, якім я займаюся. Нават за гэтыя дзесяткі гадоў падсавецкага часу яны паспелі зрабіць безліч усяго... А ў нас жа і сродкі, і людзі, і праца выляталі ў «трубу».

А кантакты, абмен вопытам, літаратурай для нас вельмі патрэбны. Нікому не на карысць наша ізаляванасць — ні літоўцам, ні беларусам. Нам асабліва карысныя былі б грунтоўныя адносіны з літоўцамі ў плане развіцця гуманітарнай культуры, асабліва гістарычнай навукі, даследавання агульнай спадчыны. Тут шчырае і шчыльнае супрацоўніцтва з літоўскім бокам было б вызначальным. Хоць трэба разумець, што на шляху гэтага супрацоўніцтва будзе ляжаць адна перашкода: мы патэнцыяльна зацятыя сапернікі ў бачанні самой гісторыі ВКЛ, вызначэнні прыналежнасці яго спадчыны. Літоўцы, безумоўна, збудавалі нямала сваіх высноў на пяску, і гэта, мусіць, таксама ўтрымлівае іх ад кантакту з намі. Магчыма, яны баяцца, што многае будзе пераглядацца. Затое яны справядліва крыўдзяцца і на М. Ермаловіча, і на тое, што ў нас ледзьве не афіцыяльна гучаць тэрытарыяльныя дамаганні.

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Прыватызацыя жылля. Як яна праводзіцца?

Адкажыце, калі ласка, як можна прыватызаваць кватэру? Хто вызначае яе кошт?

М. КУЗНЯЦОЎ.
Віцебская вобласць.

Пытанні аб парадку прыватызацыі жылых памяшканняў у нашай рэспубліцы рэгулююцца Законам «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь», а таксама Палажэннем аб прыватызацыі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду, іх абслугоўванні і рамонце, зацверджаным пастановай Савета Міністраў РБ ад 30 чэрвеня 1992 года № 398.

Прыватызацыі падлягаюць (за некаторымі выключэннямі, яны будуць указаны ніжэй) жылыя памяшканні, займаемыя грамадзянамі. Такое права маюць таксама тыя, хто не пражывае ў памяшканні, але адсутнічае па месцы пастаяннага жыхарства часова і забраніраваў яго, або калі чалавек захоўвае права на карыстанне жылым памяшканнем у адпаведнасці з законам ці на іншых падставах. Затое не падлягаюць прыватызацыі жылыя памяшканні ў інтэрнатах, а таксама дамы і кватэры, якія з'яўляюцца помнікамі гісторыі і культуры, службовыя жылыя памяшканні, за выключэннем такіх памяшканняў у дамах калгасаў і саўгасаў. Нельга прыватызаваць пакоі ў кватэрах, якія заселены больш як адным наймальнікам. Такія жыльцы набываюць права на прыватызацыю ўсёй кватэры толькі ў выпадках вызвалення яе іншымі наймальнікамі. Таксама нельга прыватызаваць жыллё ў дамах, якія знаходзяцца на тэрыторыі, забруджанай у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (зоны эвакуацыі і першачарговага адсялення).

Калі гэтых перашкод няма і ёсць згода ўсіх паўналетніх членаў сям'і, што пражываюць з наймальнікам, ён мае права звярнуцца наконт прыватызацыі займаемага памяшкання. Заява аб гэтым падаецца ў выканком мясцовага Савета народных дэпутатаў, або адміністрацыі прадпрыемства, аб'яднання, арганізацыі ў залежнасці ад таго, каму належыць дом. Да заявы трэба прыкласці пісьмовую згоду членаў сям'і. Рашэнне аб заяве грамадзяніна павінна быць прынята не пазней двухмесячнага тэрміну з моманту яе падачы.

Цяпер аб ацэнцы кошту прыватызуемых жылых памяшканняў. Яе з улікам усіх іх якасцей вызначаюць камісіі выканкомаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый, у распараджэнні якіх знаходзіцца жыллёвы фонд. Гэта работа праводзіцца з удзелам дэпутатаў усіх узроўняў.. Грамадзяне, якія прыватызуюць памяшканні, таксама маюць права прымаць удзел у рабоце такіх камісій. Па выніках ацэнкі кошту прыватызуемага жылля складаецца акт, які падпісваюць старшыня і члены камісіі. Гэты дакумент пад распіску выдаецца грамадзяніну, які прыватызуе жылое памяшканне.

Адначасова грамадзяніну, які прыватызуе дом ці кватэру, можа быць налічана грашовая жыллёвая квота. Калі размер яе (сумы квот) роўны ці большы кошту прыватызуемага памяшкання, яно перадаецца ва ўласнасць наймальніку бязвыплатна. У тых жа выпадках, калі кошт кватэры большы за грашовую жыллёвую квоту (сумы квот) розніцу давядзецца даплаціць (калі грамадзянін не карыстаецца льготамі). Інваліды Вялікай Айчыннай вайны, сем'і загінуўшых або прапаўшых без вестак воінаў (партызан) і прыроўненыя да іх ва ўстаноўленым парадку асобы, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, сем'і асоб, загінуўшых пры выкананні дзяржаўных і грамадзянскіх абавязкаў, воіны-інтэрнацыяналісты маюць права атрымаць бязвыплатна з улікам квоты кватэры ў межах 20 квадратных метраў агульнай плошчы на кожнага члена сям'і.

Грамадзяне (або іх наследнікі) атрымліваюць бязвыплатна жылыя памяшканні, якія яны атрымалі ў дамах дзяржаўнага або грамадскага фонду ў выніку зносу жылога дома, які належаў ім на правах уласнасці. Гэта датычыць зносу пабудовы ў сувязі з выдзяленнем зямельных участкаў для дзяржаўных або грамадскіх патрэб, калі грашовая кампенсацыя не была прадугледжана і не выплачана. Варта сказаць, што законам прадугледжваюцца таксама льготы і некаторым іншым катэгорыям грамадзян.

Тая ж частка кошту кватэры, якая падлягае аплаце, можа быць выплачана ў растэрміноўку. Але тут трэба памятаць вось што. Пры прыватызацыі кватэр у дамах, якія пабудаваны да 1 студзеня 1992 года, растэрміноўка прадастаўляецца на пяць гадоў, калі першапачатковы ўзнос унесены ў размеры не менш чвэрці кошту кватэры. Калі ж прыватызуецца жыллё, пабудаванае пасля 1 студзеня 1992 года, растэрміноўка прадастаўляецца на 40 гадоў пры ўмове, што першапачатковы ўзнос быў у размеры не менш 10 працэнтаў кошту кватэры.

Адным словам, пры станоўчым вырашэнні пытання аб прыватызацыі кватэры з грамадзянінам заключаецца дагавор, які павінен быць засведчаны натарыяльна. І, нарэшце, той, хто прыватызаваў жылое памяшканне ў дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду, набывае права ўласнасці на яго толькі пасля рэгістрацыі дагавора ў выканкоме мясцовага Савета народных дэпутатаў.

Але ж можа быць і адмова ў прыватызацыі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду. Яе можна абскардзіць у судовым парадку. Спрэчкі па налічэнню грашовай жыллёвай квоты, вызначэнню кошту прыватызуемага жылля, іншыя пытанні вырашаюцца вышэйстаячым па падначаленасці органам (у залежнасці ад прыналежнасці дома, у якім знаходзіцца жылое памяшканне), а пры нязгодзе і з яго рашэннем, грамадзяне, якія прыватызуюць жыллё, маюць права звярнуцца ў суд.

Уладзімір КУПЧЫНСКІ,
юрыст, галоўны кансультант агенцтва «Інтэрюрклам» пры МЮ РБ.

На лячэнне да завадчан?

Літаральна праз месяц у пасёлку трактарабудаўнікоў адчыніць дзверы новая медыка-санітарная частка МТЗ на 850 наведвальнікаў.

Цяжка паверыць, але па прагнозах медыкаў у бліжэйшы час можа быць на 50 працэнтаў скарочана хірургічная дапамога хворым з-за адсутнасці пэўнага матэрыялу і іншых сродкаў. А аперацыі будуць рабіцца толькі ў экстранных выпадках, калі пацыенту пагражае смерць; на 30 працэнтаў будуць скарочаны самі лячэбныя ўстановы. У такіх умовах, паведаміў на сустрэчы з прафсаюзнымі актывістамі прадпрыемства галоўны ўрач МТЗ Аляксандр Шакуцін, будаўніцтва новай паліклінікі набывае асаблівае значэнне. Яна камплектуецца вядомымі ўрачамі рэспублікі, якія выказалі жаданне тут працаваць. Паліклініка будзе забяспечана сучасным медыцынскім абсталяваннем, закупленым заводам за мяжой.

Алег ПРАЦЬКО.

«Пакуль не падымем агульны ўзровень развіцця, нічога не атрымаецца»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Прыпяцкім запаведніку гарэла 3 тысячы гектараў лесу, то цяпер самы вялікі ачаг пажараў у трох запаведніках—да 10 квадратных метраў. Дырэктар Бярэзінскага запаведніка ледзь не загінуў пры тушэнні аднаго з іх, дырэктар Прыпяцкага таксама з-за пажараў апынуўся ў бальніцы. Разумееце, узрасла адказнасць людзей за сваю працу. Увесь сезон пажараў кругласутчна дзяжурылі два верталёты, запаведнікі былі забяспечаны неабходнай тэхнікай і людзьмі. Што ж датычыць развіцця ўсёй матэрыяльна-тэхнічнай базы гэтых унікальных лясных гаспадарак, то менавіта за апошнія 2 гады, калі яны перайшлі ў наша падпарадкаванне, запаведнікі выйшлі на міжнародны ўзровень. Да гэтага ж іх перадавалі з рук у рукі, як нейкіх сірот. Прыпяцкі ўвогуле быў даведзены «да ручкі». А вось сёлета ён прыняў ужо дзве групы замежных турыстаў, Бярэзінскі — 8 груп, а Белавежская пушча — 15. Даход ад турызму склаў 300 тысяч дойчмарак. Згадзіцеся, замежныя турысты выкладваць свае грошыкі «за так» не будуць. Гледзячы на заходнія адносіны да працы і адпачынку, мяняюцца і нашы людзі. Яны пачынаюць разумець, што, пакуль не падымем агульны ўзровень нашага развіцця, нічога не атрымаецца. Ні з эканомікай увогуле, ні з кожным чалавекам і яго дабрабытам у прыватнасці.

Калі раней у год былі дваты запрашэнні наведаць нашы запаведнікі, то цяпер мы запрашаем выключна па конкурсу. І маглі б атрымліваць мільён долараў прыбытку. Але пакуль што не даведзена да належнага ўзроўню база адпачынку. Будуем гасцініцу на 100 месцаў у Белавежскай пушчы, 10 мільёнаў рублёў капітальных укладанняў зроблена ў Прыпяцкі запаведнік, не застаўся па-за ўвагай і Бярэзінскі.

— А ці не лічыце вы, Георгій Іванавіч, што гэтыя запаведнікі мелі б большую аддачу ў прыватызаваным выглядзе?

— Можа, гэта і больш эфектыўны спосаб вядзення гаспадарчых спраў і нагляду за навакольным асяроддзем. Але ва ўсім свеце нацыянальныя паркі, (а менавіта такім лічыцца Белавежская пушча), з'яўляюцца нацыянальным набыткам краіны і яе вялікім гонарам. Там ёсць прыватныя паркі, запаведнікі і заказнікі, але гэта ў асноўным дробныя і па маштабах і па экалагічнай значнасці прыродныя масівы. У нас жа Белавежская пушча — гэта 96 тысяч гектараў не толькі лесу, але і рэчак і яшчэ шмат чаго іншага, якое разбіваць на кавалкі было б дзяржаўным злачынствам.

— Ну, а ў Галоўным гаспадарчым упраўленні як ідуць працэсы прыватызацыі?

— А ніяк. Мы дзяржаўнае падраздзяленне і павінны даказаць, што дзяржаўная форма ўласнасці таксама мае права на жыццё.

— І як, атрымліваецца?

— Меркаваць вам. Усе падраздзяленні ўпраўлення перайшлі на гаспадарчы разлік. У нас ёсць свой саўгас, аўтабаза, атэлье. Гасцінічная гаспадарка дае больш 10 мільёнаў рублёў прыбытку.

Павінен зазначыць, што ў нас кожны спецыяліст ведае: у тых умовах, якія тут існуюць, горш працаваць ён проста не зможа. Не пацерпім. Гэта не пахвальба і не жорсткасць. Гэта падыход да справы. На новы ўзровень падняўся ўвесь наш эканамічны механізм. Стварылі свой цэнтр камп'ютэрызацыі. 19—20 чалавек могуць размаўляць на некалькіх мовах. І ніякіх ільгот і прывілей.

— Гэтак жа лічыць і парламенцкая апазіцыя?

— Са старшынёй Камісіі ВС па прывілеях Іванам Герасюком у свой час разам падрыхтавалі праект па льготах і прывілеях. І цяпер ён ужо выступае ў нашу абарону. У нашай сістэме ёсць валютныя магазіны, але купіць там штосьці можна толькі за валюту. Адзіны спрэчны пункт з апазіцыяй — Дом друку пад нашай апекай. Шчыра кажучы, я і сам доўга не згаджаўся, каб ён адыходзіў ад нас. Але цяпер разумею, што без нашай падтрымкі, без абнаўлення вытворчых фондаў Дом друку, як і нашы рэспубліканскія газеты, могуць проста загінуць. Каму гэта патрэбна? Новы шлях развіцця нашай паліграфіі фактычна цяпер у дзяржаўных руках, і ўпусціць яго, на мой погляд, проста недаравальна.

— Абнаўленне Дома друку—мусіць, не адна ваша наватарская справа?

— Былы Дом палітасветы ўжо ператварыўся ў інфармацыйны культурны цэнтр. Мы ўвайшлі ў швейцарскі міжнародны банк даных і цяпер прадаём камерцыйным і дзяржаўным структурам самую разнастайную дзелавую інфармацыю з ўсяго свету. Плануем пабудаваць пасольствы, адзіны бізнес-цэнтр еўрапейскага ўзору, дзе можна было б не толькі якасна займацца бізнесам, але і якасна адпачываць. Карацей кажучы, мы толькі за якасны ўзровень жыцця, і тыя вынікі, што мы маем сёння, сведчаць: мы на правільным шляху.

Гутарыў Аляксандр КОКТЫШ.

З ЗАЛЫ СУДА

У ПЯТЛІ СКВАПНАСЦІ

У «Звяздзе» за 26 лютага гэтага года ў артыкуле пад назвай «Кавалак з чужога рота» расказвалася аб тым, што ў крадзяжы гуманітарнай дапамогі ў Брагіне замешаны мясцовыя медыцынскія работнікі. Гэта крымінальная справа тады толькі-толькі раскручвалася праваахоўнымі органамі. Тут і спрацавалі, можна сказаць, на «выдатна» работнікі райпракуратуры і Брагінскага РАУС. На кватэрах галоўнага ўрача цэнтральнай бальніцы Васіля Пярэу і медсястры Людмілы Рудзянок тэрмінова былі зроблены вобыскі. Менавіта яны паквапіліся на заморскі пірог, які па каналах службы міласэрнасці прыбываў на іншаземных фургонах у бальніцу раёна для хворых, якія найбольш пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі.

Нагадаем нашым чытачам, што гэтыя матэрыяльна адказныя службовыя асобы райбальніцы, злоўжываючы сваім службовым становішчам, нахабна насілі важкімі сумкамі дамоў мясную тушонку і агароднінныя кансервы замежнай вытворчасці, напітак какавы, шакаладныя цукеркі, дзіцячыя пюрэ і джэмы, аднаразовыя шпрыцы, спірт і рыбін тлушч, дазіметрычныя прыборы, вострадэфіцытныя медыкаменты, лякарствы, якія зніжаюць уздзеянне радыяцыі на арганізм чалавека, многае іншае.

Выкрытыя ў гэтым асобы адразу ж былі затрыманы і арыштаваны.

І вось 13 жніўня ў народным судзе Брагінскага раёна пачаўся суд над раскрадальнікамі гуманітарнай дапамогі: былымі галоўным урачом раённай бальніцы Васілём Пярэу, старшымі медыцынскімі сёстрамі райбальніцы Святланай Хітаравай і Людмілай Рудзянок. «Нарэшце справядлівасць, мусіць, возьме верх!» — гаварылі многія брагінцы.

Але кралі-распакоўвалі пасылкі дабрачыннасці яны разам, а адказ трымалі неаднолькава: В. Пярэу і Л. Рудзянок дзесьці паўгода назад былі ўзяты пад варту і знаходзіліся ў следчым ізалятары. Да С. Хітаравай была праяўлена гуманнасць: у яе грудное дзіця. Таму і ў зале суда першыя сядзелі пад вартай канвою, а С. Хітарава — асобна, наперадзе агароджаных хаўрэснікаў.

Яны прывыклі на нас, звычайных смяротных, глядзець звысоку, з пагардай. Становішча дазваляла. Цяпер жа зусім пазбягалі позіркаў людзей. Становішча прымушала.

Месцы пацярпеўшых пуставалі, бо нельга было змясціць тут усіх, каго абрабавалі Пярэу, Хітарава і Рудзянок. Пацярпеўшыя — гэта хворыя дзеці, паўгалодныя састарэлыя.

Кожнаму, хто сапраўды мае патрэбу ў лякарствах, харчовым падмацаванні, вядома, асабіста не дапаможаш. Слалі спачатку проста на бальніцу, не сумняваючыся, што людзі ў белых халатах (самай гуманнай прафесіі) размяркуюць і аддадуць усё па прызначэнню. Пасля сталі прывозіць са сваімі прадстаўнікамі. Пазнаёміліся, зразумела, у першую чаргу з галоўным урачом.

І не толькі запрасілі яго ў госці ў Германію, а сталі прысылаць усё на адрас: Брагінская раённая бальніца. Пану В. С. Пярэу». Адрас канкрэтны, а змесціва, вядома, прызначалася хворым. І дарма Васіль Сяргеевіч спрабаваў паказаць сябе нават пакрыўджаным: маўляў, абвінавацілі ў прысваенні, а распакоўваў і браў, бо лічыў, што гэта даслана асабіста яму. Браў не ўсё, частку, астатняе аддаваў у агульны кацёл. Думаецца, гаварыў гэта не без падказкі знаходлівых адвакатаў.

Бачыце, які дабрадзей! Толькі ж нічога, акрамя смеху, не выклікалі ў зале такія прызнанні.

В. Пярэу і Л. Рудзянок народны суд прызнаў вінаватымі ў злоўжыванні службовым становішчам, а С. Хітаравай былі дабаўлены таксама крадзеж і захоўванне наркатычных сродкаў.

Здзіўляюць цынізм, упэўненасць у беспакаранасці, непавага да хворых людзей. Кралі ж тыя, каму даверaны былі не толькі матэрыяльныя каштоўнасці, а і чалавечае жыццё. Для іх, аказваецца, былі не пісаныя звычайныя правілы прыстойнасці. Жахліва становіцца ад думкі, каму людзі даверяюць сваё жыццё. Не гаворачы аб матэрыяльным боку. Там жа былі лякарствы, якім нават няма аналагаў у былой Краіне Саветаў.

Чаму ж стала магчымым такое бессаромнае і даволі працяглае раскраданне гуманітарнай дапамогі?

— Парадку няма з атрыманнем гуманітарнай дапамогі не толькі ў нас, а і ў рэспубліцы,—сказаў суду В. Пярэу.

Таму і браў — прама з машыны. Належных дакументаў не было, справаздачы нікому не рабілі. Адбіраў патрэбнае сабе, а астатняе ўжо рэгістравалі як падачку тым, хто дажываў апошнія дні: сіла ўлады, бескантрольнасць, цяга да дармаўшчыны зрабілі іх нахабнымі, упэўненымі, што толькі яны з'яўляюцца гаспадарамі становішча і могуць нажывацца на чужым горы.

Паехаў Васіль Сяргеевіч неяк у Камарын. Тут наведаў садыслі. Абышоў, агледзеў усё пагаспадарску, і ў вочы кінулася пральная машына.

— Заўтра прыедуць — перадайце ў Брагін, — на хаду кінуў галоўнаму ўрачу Камарынскай бальніцы Зоі Міхайлаўне Лабачовай.

Сказана — зроблена. «Вятку» транзітам праз Брагін завезлі аж у Мінск, на кватэру В. Пярэу. Для суда, між тым, гатова апраўданне:

— Не ведаў цаны, ды і не паспеў аплаціць. А жонка ж нават грошы дала...

Чаму не ўзяў у магазіне? Упэўнены, і пры любой чарзе брагінскія гандляры не адмовілі б галоўнаму ўрачу раённай бальніцы.

— Яна патрэбна нам, мне фізічна працаваць нельга, — сказала жонка падсуднага пра пральную машыну «Вятка».

Або пазваніў галоўнай медсястры Камарынскай бальніцы. Тая да галоўнага ўрача.

— Васілю Сяргеевічу спірт патрэбен тэрмінова!

Адмовы таксама не было. Самі налілі і прывезлі ў Брагін, занеслі ў кабінет. Калі над галовамі, як кажуць, згусціліся чорныя хмары, з асабістай кішэні ўнеслі грошы за спірт — толькі б дагадзіць брагінскаму начальніку.

— Вам не здаецца, што гэтую нястачу абавязаны пакрыць вы? — звярнуўся да Пярэу на судзе пракурор Дашук.

— Мы можам... заплаціць...

Браў сам, а націскае на «мы». Аналагічнае было і з тэлевізарам з Савіцкай участковай бальніцы, які аказаўся больш патрэбным на кватэры Пярэу у Брагіне (часовай, бо ў Мінску ёсць яшчэ адна, дзе жыве сям'я).

Навошта браў-краў?

— Сумна без сям'і аднаму было...

— А бальнічны электракардыёграф чаму апынуўся ў вашай мінскай кватэры?

— У мяне жонка хворая, — такі пачулі на судзе адказ.

Людміла Рудзянок сядзела, схіліўшы галаву ніжэй бар'ера, нягучна плакала. З першага погляду — зусім бязвінны чалавек. Толькі жаласць знікае, калі паглыбляешся ў справу. Узяўшы раз, адчыўшы асалоду нажывы, яна ўжо не магла спыніцца. Пакуль не прыйшлі з вобыскам, не арыштавалі.

Праўда, час, праведзены ў камеры папярэдняга зняволення, прымусіў самакрытычна паглядзець на свае злачынныя дзеянні. Хочацца верыць у яе словы прызнання частковай віны, поўнага раскаяння. Дарэчы, гэту і іншыя акалічнасці суд улічыў, таму і вызваліў яе з-пад варты і пакінуў на волі.

Не чорт падаткнуў, а ўласная сквапнасць прывялі на лаву падсудных Святлану Хітараву. Цяпер плача, а што думала, калі цягнула дадому дэфіцытныя медыкаменты? Калі ішла ў дэкрэтны водпуск, маючы на рахунку немалыя матэрыяльныя сродкі, нават не перадала іх па акту Л. Рудзянок. Маўляў, свае людзі — давяраю, разлічымся.

Які ж прысуд вынесены «нашым героям»? Канчатковага яшчэ няма. Справа пайшла на перагляд у абласны суд. Толькі ж ёсць яшчэ і маральны бок, суд сумлення.

Надышоў усё ж час справядлівай расплаты. І ад яе нікуды не дзенешся.

Уладзімір КРЫЖАНОЎСКІ,
карэспандэнт брагінскай раённай газеты «Маяк Палесся».

РОЗГАЛАС

У ЗОНЕ АДБУДУЦЦА ЗМЕНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

называў такія лічбы росту захворванняў за апошнія гады, што пры захаванні гэтай прагрэсіі праз некалькі дзесяцігоддзяў кожнага здаровага беларуса можна будзе заносіць у Чырвоную кнігу.

Больш глыбокаму знаёмству з жыццём і бытам заложнікаў Чарнобыля і прысвяціў сваю паездку па Брагінскаму і Хойніцкаму раёнах першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Вячаслаў Кузняцоў. Сустракаючыся з насельніцтвам, ён прасіў не разглядаць яго візіт як фармальны, «для птушкі». Хоць перакананаць у адваротным тутэйшае насельніцтва не так проста: за шэсць з палавінай гадоў людзі наглядзеліся на ўсякага рангу начальства. Цяперашні госць заявіў, што ў кастрычніку пытанне аб лёсе зоны з узроўнем забруджвання ад 15 да 40 кюры будзе разгледжана на пасяджэнні Прэзідыума Вярхоўнага Савета і гэта тэрыторыя атрымае пэўны статус. Уласны пункт гледжання на нарадзе з кіраўнікамі гаспадарак і вучонымі ў саўгасе «Стралічава» Хойніцкага раёна ён выклаў коратка: раз тут жывуць людзі, а вучоныя - радыёлагі дапускаюць такую магчымасць, значыць, ніхто не павінен перашкаджаць гэтаму. Але ўсе жыхары зоны павінны быць забяспечаны неабходным наборам сацыяльна - бытавых даброт на больш высокім узроўні, чым сярэднерэспубліканскі. І ні ў якім выпадку гэтыя людзі не павінны адчуваць сябе забытымі і абдзеленымі.

Віктар КОТАЎ.
(БЕЛІНФАРМ).

Гомель.

Міжнародны дзень музыкі галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Аляксандр АНІСІМАЎ сустрэў у Лондане. Яго запрасіў Мсціслаў Растропавіч для выканання «Ваеннага рэквіема» Б. Брытэна з удзелам Лонданскай каралеўскай філармоніі, хору і салістаў.

Наступны сезон для А. Анісімава будзе цікавым і насычаным. Рыхтуюцца прэм'еры ў родным тэатры, чакаецца стварэнне новага сімфанічнага аркестра Мінска і першыя яго канцэрты, запісы на дыскі. Напярэдадні ў Анісімава і гастролі — Пецярбург, Мадрыд, ЗША, Германія.

Фота Уладзіміра МЯЖЭВІЧА.
(БЕЛІНФАРМ).

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

АТЭЛЬ «САБАЧАЯ РАДАСЦЬ»

Сабачая гасцініца адкрылася ў прыгарадзе Каўнаса—Юліенаве. Праўда, усяго на шэсць нумароў, якія, аднак, заўсёды бываюць занятыя. Умовы пражывання для чацвераногіх пастаяльцаў такія: адзін дзень з начоўкай каштуе 75 рублёў (амаль як для людзей у курортных месцах), за харчаванне трэба плаціць дадаткова, тады ваш гадаванец будзе атрымліваць кожны дзень 200 грамаў мяса, столькі ж тварагу, малака і нават белы хлеб. Адна з галоўных умоў пражывання сабак у «атэлі» — даведка ад ветэрынара.

НЯЎЖО ПЕРАМОЖАМ ЯДЗЕРНАГА ДЖЫНА?

У Мінску праходзіць першае пасяджэнне Каардынацыйнага савета, створанага ў рамках Пагаднення аб міжнародным супрацоўніцтве па пытаннях, звязаных з ліквідацыяй вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Каб пазбегнуць напышлівасці і рытарычнасці, не будзем сцвярджаць, што ў адносінах міжнароднага супольніцтва да чарнобыльскіх праблем, як іх разумеюць у Беларусі, на Украіне і ў Расіі, адбыўся, што называецца, гістарычны пералом. Не будзем упадаць у манілаўшчыну і зноў жа сцвярджаць, што лабісцкая дзейнасць такой уплывовай арганізацыі, як МАГАТЭ, даволі шкодная для трох дзяржаў СНД, найбольш пацярпеўшых ад ядзернай навалы, канчаткова пераадолена. І тым не менш наступальная, актыўна - растлумачальная пазіцыя, занятая на міжнароднай арэне, у прыватнасці, урадам Беларусі і яе навуковымі коламі, прыносіць свой плён.

Аб гэтым сведчыць, напрыклад, факт падпісання Пагаднення аб супрацоўніцтве ў плане вырашэння чарнобыльскіх праблем паміж Камісіяй еўрапейскіх супольніцтваў (КЕС), з аднаго боку, і трыма вышэйпамянёнымі краінамі СНД — з другога. Сведчанне таму і стварэнне такога міжнароднага органа, як Каардынацыйны савет, які з 5 па 7 кастрычніка праводзіць у беларускай сталіцы сваё першае пасяджэнне.

Выбраны кіраўніком пасяджэння намеснік Старшыні Саўміна Беларусі, старшыня Дзяржкамчарнобыля РБ І. Кенік заўважыў, што пры ўсіх цяжкасцях постчарнобыльскай сітуацыі рэспубліцы змаглі дабіцца значных арыхтаў да лепшага — завершана ў асноўным перасяленне людзей з заражанай зоны, створаны шэраг спецыялізаваных інстытутаў, набыты салідныя навуковыя распрацоўкі. Аднак, падкрэсліў ён, апошнія пакуль не могуць быць выкарыстаны той жа КЕС, паколькі мы не ўваходзім у адзіную інфармацыйную сістэму.

Так акрэсліўся шлях сумеснай дзейнасці, прычым з усёй адказнасцю было заяўлена, што ўрад Рэспублікі Беларусь акажа ўсямерную падтрымку рабоце Каардынацыйнага савета, ажыццяўленню яго напрацовак. Некаторыя з іх, дарэчы, ужо прадстаўлены — як вучонымі Беларусі, Украіны, Расійскай Федэрацыі, так і даследчыкамі КЕС.

Значыць, ёсць надзея, што ядзерны джын будзе нарэшце канчаткова загнаны назад у бутэльку? Горкі вопыт не дае падстаў нам, беларусам, спадзявацца на чарговую чароўную палачку. Аднак пры ўсім скепсісе нельга не заўважыць, што міжнароднае супрацоўніцтва ў барацьбе з вынікамі Чарнобыля ўзнімаецца на больш высокі ўзровень.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ.

«НЕ ПЛАЧ, ДЗЯЎЧЫНКА, ПРОЙДУЦЬ ДАЖДЖЫ...»

Пачынаецца асенні прызыў. Якім ён будзе? З гэтым пытаннем наш карэспандэнт звярнуўся да **начальніка аддзела камплектавання арганізацыйна -мабілізацыйнага ўпраўлення Міністэрства абароны палкоўніка Яўгена Анатольевіча Бяльдзяева.**

— Дакладную колькасць прызыўнікоў пакуль што не ведаю, бо не вырашана пытанне аб прадастаўленні адтэрміноўкі асобным катэгорыям. Але я думаю, колькасць прызыўнікоў гэтай восенню будзе ў межах дваццаці тысяч.

— Ці будуць прызываць грамадзян Рэспублікі Беларусь за яе межы?

— Не. Хоць заявы жадаючых служыць у флоце былі. Гэтых хлопцаў мы плануем адправіць служыць у Пінскую флатылію — адзінае марское падраздзяленне ў нашай рэспубліцы. Таксама нашы прызыўнікі не будуць накіроўвацца ў воінскія часці, падпарадкаваныя Расіі, але размешчаныя на тэрыторыі Беларусі.

— Па якому прынцыпу плануецца размеркаваць прызыўнікоў па тэрыторыі рэспублікі?

— Раней мы кіраваліся экстэрытарыяльным прынцыпам, г. зн. далей ад дому. Цяпер, у асноўным, — тэрытарыяльным. Аднак, калі ў данай мясцовасці воінскіх часцей няма або ў спецыялістах данай прафесіі ёсць патрэба, скажам, за 300—400 км ад дому, то аб тэрытарыяльным прынцыпе гаворкі быць не можа.

— Якімі законамі кіруецца Міністэрства абароны пры правядзенні прызыву?

— Старымі законамі СССР. Да гэтага часу ў рэспубліцы няма законаў аб усеагульным воінскім абавязку, аб статусе ваеннаслужачага і палажэнні аб праходжанні воінскай службы. Праекты ёсць, але разглядаць іх плануюць недзе ў канцы бліжэйшай сесіі. У адрозненне ад Расіі мы яшчэ не вырашылі нават пытання аб тэрмінах тэрміновай службы: будзе гэта 1,5 або 2 гады. А не сакрэт жа, што менавіта з-за гэтага адбываецца шмат ухіленняў ад прызыву.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.
(БелаПАН).

КОЛЬКІ ВЯРОВАЧЦЫ НІ ВІЦЦА...

Сродкі масавай інфармацыі паведамлялі ўжо пра праведзеную службай па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю МУС Беларусі аперацыю «Дэфіцыт». Нагадаем, было праверана 7.378 аб'ектаў гандлю; выяўлена 1.777 розных парушэнняў, 328 злачынстваў, узбуджана 264 крымінальныя справы, знойдзена ўтоеных ад свабоднай рэалізацыі тавараў на суму 2 млн. 767 тыс. рублёў. А вось як выглядаюць «перадавікі» па раёнах:

	Мінская вобласць	Віцебск	Магілёў	Мінск
Праверана аб'ектаў гандлю	1.695	1.113	1.476	684
Парушэнняў	232	259	523	257
Злачынстваў	26	48	58	97
Узбуджана крымінальных спраў	21	37	55	89
Утоена тавараў ад свабоднай рэалізацыі на суму	894.700	606.727	428.400	160.882

НЕКАЛЬКІ КРАСАМОЎНЫХ ПРЫКЛАДАЎ

За хабар у 20 тысяч рублёў загадчык гомельскага магазіна № 2 прадаў кіраўнікам гомельскага МП «Эліп» (з тыповымі армянскімі прозвішчамі) 2,5 тоны масла і 200 кг сыру, якія тыя спрабавалі вывезці ў Арменію.

Напэўна, чытачы заўважылі, што па колькасці ўзбуджаных крымінальных спраў «лідзіруе» Мінск. Асабліва «вызначыліся» гандлёвыя пункты на тэрыторыі Савецкага раёна. У ліпені (памятаеце цукровы бум?) у падсобках магазіна «Сталічны» ўтойвалі ад рэалізацыі 1,3 тоны цукру. У адносінах да намесніка загадчыка аддзела ўзбуджана крымінальная справа. Аналагічнае парушэнне ў магазінах «Тавары для жанчын» (адна крымінальная справа), «Зорка» (тры). Неўзабаве павінна паўстаць перад судом загадчыца магазіна № 4 гаркаапгандлю (на Камароўскім рынку), якая «спецыялізавалася» на завышэнні цэн на каўбасныя вырабы.

Віктар ФЕДАРОВІЧ,
(БелаПАН).

Выпуск «Розгаласа» падрыхтавалі: І. Карней, А. Коктыш, А. Сланеўскі, С. Сулкоўскі, І. Шчучэнка.

Беларусь і сусветнае супольніцтва: погляд у будучыню

Выступленне міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь П. КРАЎЧАНКІ ў ходзе агульнай дыскусіі на 47-й сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый

Шчаслівы народ, які пажынае плады некалькіх стагоддзяў устойлівага развіцця — развіцця ў лоне трывалай дзяржаўнасці і нацыянальнай культуры, не азмрочанай прыгнётам.

Але ёсць і іншы лёс — ісці скрозь стагоддзі да аднаўлення сваёй дзяржавы, не даваць затушыць светач сваёй культуры і дасягнуць нарэшце доўгачаканай мэты — суверэнітэту, незалежнасці. Гэта ж таксама шчасце. Асабліва шчасце. Цяжкае шчасце.

Менавіта ў гэтых словах — цяжкае шчасце — я выказаў бы сутнасць сённяшняга настрою і пачуццяў, якія перажывае мой народ.

Адзін з тытанаў беларускай культуры і нацыянальнага духу, Якуб Колас, з вялікай сілай раскрыў у паэме «Новая зямля» адвечную мару беднага беларускага селяніна аб зямлі, якая належала б толькі яму, дзе ён быў бы гаспадаром, што не залежыць ад прыхамаці чужой волі.

Беларусь — адзін са старажытных ачагоў славянства — гэта новая зямля і новая краіна, зноў набытая беларускім народам. Мэты свабоды, паўнапраўнага валодання сваёй краінай, вызвалення ад прытнёту ў любых яго праявах, што стагоддзямі сілкавалі гістарычную волю нашага народа, пачынаюць сёння ажыццяўляцца.

Год назад на мінулай сесіі Генеральнай Асамблеі ў выступленні беларускай дэлегацыі была выкладзена пратрама нашых прыярытэтаў у галіне знешняй палітыкі: паласа дыпламатычных прызнанняў, стварэнне замест Саюза ССР Садружнасці дзяржаў, бяз'ядзерны статус Беларусі, яе нейтралітэт.

Коратка падводзячы сёння вынікі зробленага за год, хацеў бы з пачуццём задавальнення канстатаваць, што многае рэалізавана.

Створана Садружнасць Незалежных Дзяржаў, народжаная ў Віскулях, на беларускай зямлі. Рэспубліка Беларусь прызнана больш чым 100 дзяржавамі свету, з 60 з іх устаноўлены дыпламатычныя адносіны. Наша дзяржава стала паўнапраўным удзельнікам Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, членам Міжнароднага валютнага фонду, Сусветнага банка і іншых міжнародных фінансавых інстытутаў, прыняла ў сябе аддзяленне ААН/ПРААН.

Ядзерная тактычная зброя поўнасцю выведзена за межы Беларусі. Стаўшы ўдзельнікам Дагавора аб СНУ і Лісабонскага пратакола да яго, Беларусь абавязалася не працягу сямі гадоў вывесці і зброю стратэгічнага прызначэння. Магчыма, гэта будзе зроблена і раней. Мы дыстанцыраваліся ад уздзелу ў ваенных і ваенна-палітычных саюзах і блоках. Зробленае стварае для нашай дзяржавы першасную аснову, плацдарм, з якога мы можам і павінны ісці далей.

Пан Старшыня!

Ёсць нейкія нябачныя ніці, якія звязваюць у адно цэлае сучаснае і мінулае, духоўны патэнцыял культуры як элемент палітычнага выбару, лёсаносных рашэнняў на крутых пераходных этапах гісторыі. Стварыўшы неабходныя асновы дзяржаўнасці і знешняй палітыкі, **Беларусь сёння — «на ростанях», на раздарожжы, на перакрыжаванні гісторыі.** Праблема выбару, арыентацыі асабліва сугучная з цяперашнім пераходным этапам нашага жыцця. Куды і як пойдзе Беларусь? Якія каштоўнасці будуць сілкаваць карані яе дзяржаўнага дрэва? Што чакае ў блізкім і далёкім будучым наш шматпакутны народ?

Думаю, што наўрад ці хто асмеліцца зараз катэгарычна і адназначна даць адказ на гэтыя і многія іншыя няпростыя пытанні.

Можна выказаць толькі пэўныя доўгатэрміновыя меркаванні, а ў прагнозным плане —шэраг ідэй і прынцыпаў, якія датычаць некаторых сфер нашых дзеянняў.

Эканамічная сфера. Арыенцір тут — на Садружнасць Незалежных Дзяржаў як форму **эканамічнага** ўзаемадзеяння.

Жыццё пасарамаціла тых скептыкаў, якія прагназіравалі хуткі і неміну чы развал Садружнасці. Так, яна сёння ўсё яшчэ нагадвае кволае дзіця, але дзіця, якое, на нашу думку, павінна па-сапраўднаму стаць на ногі. Садружнасць (у тым ці іншым саставе) вытрымае, выстаіць, таму што ў сённяшніх умовах — гэта форма эканамічнага ўзаемавыжывання. Форма **вымушаная, але непазбежная, без якой цяжка разлічваць на фарміраванне ўсходнееўрапейскага рынку.** Трэба зразумець: тое, што ствараецца сёння яго ўдзельнікамі, не можа адразу стаць развітой, перадавой рыначнай мадэллю. 10—15 гадоў мы будзем усё яшчэ спатыкацца, — і паступова рухацца да стану **«рыначнай цывілізаванасці»,** які нарэшце дасць магчымасць сур'ёзна паставіць пытанне аб інтэграцыі з ЕС — «Агульным рынкам».

Мы перакананы, што ў будучы адносна працяглы перыяд у Еўропе будуць **паралельна развівацца ў напрамку паступовага збліжэння** адзін з адным два эканамічныя ўтварэнні—ЕС і тое, што ўмоўна можна назваць фарміруемым Усходнееўрапейскім эканамічным супольніцтвам. Для Беларусі—гэта ўжо не столькі цывілізаваная форма эканамічнага «разводу», колькі магчымасць стварыць новую якасць жыцця, падрыхтавацца разам з іншымі дзяржавамі да ўступлення ў агульнаеўрапейскі рынак.

Інакш кажучы, для нас, як і спадзяёмся, для шэрагу іншых дзяржаў СНД, — гэта не замкнутасць, не эканамічная аўтаркія, а форма развіцця, унутранай трансфармацыі, асноўнай сутнасцю і канчатковай мэтай якой з'яўляецца Новая Еўропа. Ідэя «агульнага дома» для еўрапейцаў стане па-сапраўднаму рэальнай толькі тады, калі адбудзецца выраўноўванне ўзроўняў эканамічнага развіцця.

Зараз мы змагаемся пакуль за тое, каб не дапусціць празмернага зніжэння ўзроўню эканамічнага патэнцыялу. Спецыфіка падыходу Беларусі да рэформаў заключаецца ў тым, што **дынаміка стварэння новых рыначных структур павінна поўнасцю адпавядаць дынаміцы адмірання старых эканамічных структур.** Такі гарманічны падыход дае магчымасць пазбегнуць крайнасцей з аднаго боку, неапраўданага забягання наперад, з другога — жорсткай кансервацыі аджыўшага.

Мы перакананы, што, пераадолеўшы цяжкасці, беларускі народ ажыццявіць сваю векавую мару — «стаць раўнёю славай і сілай іншым народам» (Я. Купала).

Палітычная сфера. У гэтай галіне мы будзем працяваць дзейнічаць у строгай адпаведнасці з канстытуцыйным прынцыпам нейтралітэту і бяз'ядзернасці. Прычым кожны з іх разумеецца намі не як данасць, не як «момант ісціны», а як **мэта, якая нарадзілася ў нетрах народнай свядомасці ў ходзе нашай трагічнай гісторыі.**

Рух да нейтралітэту і бяз'ядзернасці мы бачым як **працэс умацавання незалежнасці і суверэнітэту Беларусі, набыцця свайго «палітычнага твару»,** працэс разрыву тых цянётаў, якія ў будучым маглі б стаць перашкодай для свабоднай, свядомай інтэграцыі ў структуры, што аб'ектыўна дыктуюцца сусветным развіццём.

Мы выразна разумеем, што паняцце «класічны нейтралітэт» перажывае радыкальныя змяненні свайго зместу. Вечнага нейтралітэту ва ўзаемазалежных Еўропе і свеце, як і вечнага рухавіка, у прыродзе няма і быць не можа. Рэалі нядаўніх крокаў, якія робяцца еўрапейскімі краінамі традыцыйнага ці даговорнага нейтралітэту, сведчаць аб гэтым.

Мы ж, беларусы, выходзячы з нашага трагічнага мінулага, рамантызавалі і рамантызуем нейтралітэт. Гэта проста ўжо на ўзроўні інстынкту нацыі. На нас так часта нападалі і спрабавалі знішчыць, што ўсё яшчэ здаецца: вось калі станем нейтральнымі — гэта гарантуе нашу бяспеку.

Аднак па-сапраўднаму нейтральнай Беларусь можа быць толькі тады, калі **па-заблокавай стане Новая Еўропа,** калі НАТО, як і ўчора Варшаўскі дагавор, адыдзе ў нябыт, калі свабода руху ідэй, людзей, капіталаў, тавараў і паслуг стане прывычнай рэальнасцю.

Дэмакратычная інстытуцыяналізацыя. Безумоўна, асноўныя надзеі мы звязваем тут з прыняццем новай Канстытуцыі, якая зробіць працэс дэмакратызацыі незваротным. Думаю, што гэта можа адбыцца ў бліжэйшыя месяцы ў ходзе другога чытання праекта нашай Канстытуцыі, намечанага на кастрычнік бягучага года. У яе праекце закладзены такія фундаментальныя каштоўнасці і прынцыпы, як

— палітычны плюралізм;

— прымат нормаў міжнароднага права;

— падзел заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады пры ўзаемакантролі ўсіх трох галін дзяржаўнага арганізма;

— увядзенне нормаў прамога дзеяння ў адносінах правоў чалавека, парушэнне якіх аўтаматычна выклікае дзеянне судовых інстанцый;

— правядзенне глыбокай і комплекснай судовай рэформы, накіраванай на рэфарміраванне Грамадзянскага і Грамадзянска-працэсуальнага кодэксаў, Кодэкса законаў аб працы, Крымінальнага і Крымінальна-працэсуальнага кодэксаў, стварэнне суда прысяжных;

— стварэнне Канстытуцыйнага суда;

— строгае захаванне правоў нацыянальных меншасцей на аснове рэкамендацый Капенгагенскай сустрэчы НБСЕ па чалавечаму вымярэнню 1990 года і Парыжскай Хартыі 1991 года.

У гэтай галіне, выходзячы з прынцыпаў нашай традыцыйнай талерантнасці ва ўсіх сферах, уключаючы канфесіянальную, мы маем намер і ва ўмовах «бурлівай Еўропы» працягваць падтрымліваць высокі стандарт. Мы ганарымся, тым, што за ўсю нашу шматвяковую гісторыю ў нас ніколі не было, нягледзячы на «рысу аседласці», такіх крайніх праяўленняў шавінізму, як яўрэйскія пагромы ці падобныя акцыі на нацыянальнай глебе. Непахісныя прынцыпы — сапраўднае міралюбства, павага да іншых, талерантнасць, захаванне права кожнага этнасу, нягледзячы на яго колькасць, мець свой нацыянальны твар і роўныя грамадзянскія правы — мы захаваем і памножым у сучаснай Еўропе.

Мы спадзяёмся, што ўнікальны міжканфесіянальны баланс, які гістарычна склаўся ў Беларусі, будзе цаніцца і паважацца ўсімі, ён не стане аб'ектам знешніх маніпуляцый. **Мы ў Беларусі не ставім знак роўнасці паміж канфесіянальнай і этнічнай прыналежнасцю грамадзян Беларусі.**

Пан Старшыня!

Фіксаванне незвычайнасці нашага часу насам ператвараецца ўжо ў банальную канстатацыю. Аднак настаў час выходзіць за рамкі і простай канстатацыі перамен, і прастадушнага замілавання перад раптоўным знікненнем ранейшых глабальных напружанняў. Так, распад таталітарнай сістэмы — як грамадска-палітычнай, так і сістэмы дзяржаў — прывёў да фактычнага знікнення восі напружанасці паміж дзвюма глабальнымі процістаўнымі ваенна-ідэалагічнымі групоўкамі. Адна прынцыповая схема міжнародных адносін, якая была характэрнай для большай часткі XX стагоддзя, змяняецца ці ўжо змянілася другой. **Але гэта яшчэ не азначае аўтаматычнай бесканфліктнасці.** Новая схема парадаксальным чынам нагадвае тую, што была закладзена Венскім кангрэсам і была характэрна для Еўропы XIX стагоддзя, асабліва яго другой палавіны, з мноствам цэнтраў сілы і багаццем міждзяржаўных і ўнутрыдзяржаўных, часам этнічных па зместу канфліктаў. Бясспрэчна, аналогія тут не прамая, але рысы падабенства выклікаюць трывогу, якая актыўна падмацоўваецца крывавымі канфліктамі ў Югаславіі, Нагорным Карабаху, Грузіі, Малдове, што яшчэ некалькі гадоў назад здаваліся неўяўляемымі для Еўропы. І нарэшце, усе мы памятаем, у якіх катастрафічных канвульсіях аканала гэта міжнароднае ўстройства ў пачатку стагоддзя дваццатага.

Прынятая затым палітычная структура постверсальскай Еўропы таксама аказалася контрпрадуктыўнай. Стварэнне субрэгіянальных груповак накшталт Малой Антанты, аморфнай сістэмы псеўдакалектыўнай бяспекі паказалі ў канчатковым выніку поўную нядзеяздольнасць Лігі Нацый і не выратавалі свет ад пажару другой сусветнай вайны.

Так і сёння. Думаецца, што Еўропа, калі не будуць прыняты тэрміновыя меры, зусім не наблізіцца да стану поўнага дабрабыту і спакою. **Унутранае напружанне на кантыненце нарастае.** Залішне шырокія тлумачэнні НБСЕ ўцягваюць яе ў новыя крызісныя сітуацыі на еўразійскай прасторы, ускладняюць магчымасць дасягнення якіх-небудзь канкрэтных вынікаў на пачатковай стадыі крызісаў, што праяўляюцца. Няўжо сумны вопыт мінулага нас нічаму так і не навучыў? Так, ядзерная пагроза адыходзіць, але колькасць ахвяр у звычайных канфліктах тым не менш жахае.

Я далёкі ад таго, каб займацца змрочнымі прадказаннямі. Больш таго, наша агульная стратэгічная мэта — стварэнне алзіянга еўрапейскага дома — зусім рэальная для дасягнення. Але не будзем забываць, што толькі што вызначаныя ўскладненні на гэтым шляху таксама носяць рэальны характар. Неабходна выразна бачыць і пераадольваць іх, каб сумеснымі намаганнямі рухацца да пастаўленай мэты.

Галоўныя перавагі новага светапарадку у параўнанні з мінулым стагоддзем заключаюцца, на мой погляд, у вабытым чалавецтвам горкім вопыце, пазбегнуць паўтарэння якога мы павінны, а таксама ў наяўнасці дзеючай, універсальнай арганізацыі дзяржаў, заклікана забяспечыць міжнародны мір і бяспеку.

Важна, аднак, сумеснымі намаганнямі даць ААН магчымасць адыграць прынцыпова новую практычную ролю ў прадухіленні і «гашэнні» канфліктаў, якія ўсё яшчэ ўзнікаюць.

Зараз і неабходна, і магчыма радыкальна ўзмацніць ролю ААН у кантролі за ажыццяўленнем абавязацельстваў дзяржаў па існуючых міжнародных пактах і канвенцыях у галіне правоў чалавека. Пытанні карэннага павышэння ролі Арганізацыі ў гэтых адносінах маглі б стаць адным з пунктаў парадку дня на Сусветнай канферэнцыі па правах чалавека, якая адбудзецца ў наступным годзе ў Вене.

Неабходна прадухіліць раскол свету па прыкмеце дабрабыту. **Замкнутыя «аазісы працвітання» не змогуць бясконца існаваць.** Яны робяць свет няўстойлівым. Сёння, як ніколі раней, неабходна забяспечыць шматбаковае наступленне на сусветныя эканамічныя праблемы.

Ліквідацыя патрозы ядзернай вайны і набліжэнне тэхнагенных напрузак на глабальнае навакольнае асяроддзе да граничных заграніччных рубяжоў выявіла ўсю вастрыню праблемы экалогіі. Тут міжнароднае супольніцтва таксама павінна зрабіць выбар на карысць не канфрантацыі, а супрацоўніцтва для захавання экасістэмы Зямлі.

Не ідэалізуючы вынікі канферэнцыі ў Рыо-дэ-Жанейра, Беларусь падзяляе пункт гледжання, што гэта толькі пачатак доўгага і цяжкага шляху. Тут, нароўні з усім іншым, трэба мець на ўвазе, **што па маральнай шкале каштоўнасцей сціплыя ахвяры бедных значна даражэйшыя за ахвяраванні багатых...**

Беларусь падтрымлівае ідэі склікання ў 1995 годзе — у год 50-годдзя ААН — спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, правядзенне ў яе рамках новай сустрэчы ў вярхах у інтарэсах Зямлі для першага ўсеабдымнага агляду ажыццяўлення «Парадку дня на 21 стагоддзе», абмеркавання на ёй «Хартыі Зямлі-95», якая можа быць распрацавана на базе «Дэкларацыі Рыо-92».

Важнай вяхой у падрыхтоўцы ААН да прынцыпова новай па эфектыўнасці ролі мы лічым правядзенне 31 студзеня гэтага года ўнікальнага пасяджэння Савета Бяспекі ААН на вышэйшым узроўні. Мы высока ацэньваем даклад генеральнага сакратара ААН «Парадак дня для свету» і гатовы актыўна і з максімальнай ступенню канструктыўнасці ўдзельнічаць у абмеркаванні рэкамендацый, якія змешчаны ў ім.

Аднак ужо цяпер я магу заявіць аб нашых станоўчых адносінах да ўзмацнення актыўнасці ААН у правядзенні аперацый па падтрыманню міру і ў цэлым ва ўрэгуляванні канфліктаў, у многім створаных міжэтнічнымі супярэчнасцямі.

У прыватнасці, мы гатовы актыўна ўдзельнічаць у пошуку мірных шляхоў вырашэння нагорна-карабахскага канфлікту. Мы згадзіліся прыняць у Мінску Міжнародную канферэнцыю па гэтай праблеме і, нягледзячы на ўсе нашы эканамічныя цяжкасці, зрабілі ўсё магчымае для таго, каб стварыць неабходныя ўмовы для яе работы.

У цэлым багаж стабільнасці Беларусі як ва ўнутраным аспекце, так і на прагніцах з суседзямі, яе традыцыі культурнай і нацыянальнай талерантнасці, імкненне да няўхільнага захавання правоў чалавека, геапалітычнае становішча ствараюць ёй, на нашу думку, патэнцыял актыўнага міратворчага пасрэдніка ці каардынатара ў многіх сітуацыях, асабліва ў рэгіёнах былога СССР, ды і ў больш шырокім кантэксце. Мы гатовы прымяніць гэты патэнцыял на карысць міру, супрацоўніцтва, сапраўднай павагі правоў чалавека. Як уяўляецца, рэалізацыі гэтага патэнцыялу будзе садзейнічаць і такое вымярэнне знешняй палітыкі Беларусі, як імкненне да ўзважанай паслядоўнасці, канструктыўнасці і прадказальнасці дзеянняў.

Пан Старшыня!

Выступаючы з гэтай трыбуны як прадстаўнік краіны—ахвяры буйнейшай у гісторыі чалавецтва ядзернай аварыі і дзяржавы, якая знаходзіцца ў крайне цяжкай стадыі пераходу ад аднаго тыпу эканомікі да другога, не магу не выказаць сёння заклапочанасці ў дачыненні да двух аспектаў дзейнасці Генеральнай Асамблеі.

Рэспубліку Беларусь непакоіць затрымка з ажыццяўленнем рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН па ўмацаванню міжнароднага супрацоўніцтва і каардынацыі намаганняў у вызвалленні, аслабленні і мінімізацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы. Дакладней будзе сказаць, **амаль поўная бяздзейнасць ААН па выкананню гэтай рэзалюцыі.** Недастатковая эфектыўнасць ААН, аб чым ужо нямала было сказана з гэтай трыбуны, можа быць ярка праілюстравана і на гэтым прыкладзе, асабліва блізкім і балючым для нас. Мы на сваім ласным вопыце пераканаліся, што рэзалюцыі, у даным выпадку рэзалюцыя 45/190, прынятая кансенсусам, з саўтарствам — я звяртаю Вашу ўвагу — 129 дзяржаў, — могуць прымацца, але вынікі гэтай знешне актыўнай дзейнасці мінімальныя. Гады, якія прайшлі пасля катастрофы, пераконваюць у тым, што сёння трэба перш за ўсё спадзявацца на ўласныя сілы, на людзей добрай волі, на шэраг міжнародных дабрачынных і рэлігійных арганізацый, якім мы ўдзячныя за маральную і матэрыяльную дапамогу.

Нават той невялікі сакратарыят, які быў створаны для арганізацыі выканання ўказанай рэзалюцыі, здалёку, з Вены, маўкліва глядзіць на тое, што адбываецца, яўна не збіраючыся перабірацца ў адну са сталіц пацярпеўшых дзяржаў, бліжэй да месца падзей. Відаць, так прасцей і спакайней. А чаго вартыя спробы вывесці чарнобыльскую праблематыку за межы ААН, яе Генеральнай Асамблеі і ЭКОСОС?

Відаць, што чарнобыльскія напрамкі становяцца заложнікамі цяперашніх слабасцей ААН, яе іманентных недахопаў. Ці трэба тлумачыць, чаму пасля гэтага аўтарытэт такой універсальнай арганізацыі, як ААН, у вачах беларускага народа можа пацямнець.

У сур'ёзным пераглядзе мае патрэбу і цэлы шэраг напрамкаў адміністрацыйна-бюджэтнай палітыкі ААН. У першую чаргу крытычных адносін заслугоўвае да сябе шкала ўзносаў дзяржаў-членаў.

На жаль, пан Старшыня, у ходзе нядаўняй работы Камітэта па ўзносах былі выпрацаваны рэкамендацыі Генеральнай Асамблеі, згодна з якімі прапануецца павялічыць долю Рэспублікі Беларусь у бюджэце ААН. Стан нашай эканомікі, тым больш у пераходны перыяд, не дае для гэтага ніякіх падстаў. **Мы заяўляем аб сваёй рашучай нязгодзе з такім неабгрунтаваным рашэннем і настойваем на пераглядзе велічыні ўзносу Рэспублікі ў бюджэт Арганізацыі.** З другога боку, мы гатовы ўзяць на сябе адпаведныя фінансавыя абавязацельствы толькі з моманту юрыдычнага знікнення СССР, г. зн. са снежня 1991 года.

КАНЕЦ РАЗЛІВАЧНАГА ЦЭХА

У апошні час супрацоўнікі Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю ўсё часцей сутыкаюцца з арганізаванымі злачыннымі групамі, якія спецыялізуюцца на вырабе вадкасці з утрыманнем спірту. Не так цаўно ў Віцебску яе канфіскавана 255 літраў у бітонах. Вадкасць, якая нічога агульнага не мае з каньяком, знаходзілася таксама больш чым у трох тысячах бутэлек з каньячнымі этыкеткамі. Для аховы ўсяго гэтага злачынцы мелі наразную агнястрэльную зброю. Каб перавезці канфіскаванае, работнікам міліцыі спатрэбіліся дзве аўтамашыны «Урал».

Некалькі дзён назад супрацоўнікі Магілёўскага аддзела па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю затрымалі чатырох жыхароў Азербайджана, якія арганізавалі ў адным з дамоў прыватнага сектара Магілёва падпольны цэх па вытворчасці фальсіфікаванага каньяку.

У ходзе праведзенага вобыску ў махляроў знойдзена 240 бутэлек з этыкеткамі «Спірт збожжавы», 820 бутэлек вадкасці з каньячнымі этыкеткамі, а таксама 40-літровы бітон з вадкасцю невядомага паходжання.

Але самае дзіўнае нават не ў размаху дзейнасці спіртных фальсіфікатараў, а ў тым, што вырабляемае імі «піво» з задавальненнем скуплялася камерцыйнымі кіёскамі і магазінамі, а потым рэалізоўвалася.

Так што пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24 верасня г. г., якая ўстанавіла дзяржаўную манаполію на продаж віна - гарэлачных і каньячных вырабаў, з'явілася вельмі своечасова. Яна павінна пакласці канец вакханаліі ў гандлі спіртным, у тым ліку і яго сурагатамі.

Вячаслаў ОСЬКІН,
старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС Рэспублікі Беларусь, падпалкоўнік міліцыі.

АБЯСШКОДЗІЦЬ ЗЛАЧЫНЦУ

Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь расшуквае раней тройчы судзімага Сяргея Аляксандравіча Коўзана, які 27 верасня гэтага года ўцёк з-пад варты.

Прыкметы злачынцы: на выгляд 28—30 гадоў, рост 180 см., сярэдняга целаскладу, валасы русыя, твар бледны, лобныя залысіны.

Злачынца можа быць узброены і пры затрыманні аказаць актыўнае супраціўленне.

Просім усіх, хто ведае аб знаходжанні Коўзана, паведаміць па тэлефонах: 20-65-28, 20-63-83, 02 ці ў бліжэйшы аддзел міліцыі.

За інфармацыю, якая спрыяе пошуку злачынцы,

установлена грашовая ўзнагарода ў суме 30 тысяч рублёў. Ананімнасць гарантуецца.

Анатоль МЯСНІКОЎ

ФАБІЯН ШАНТЫР

Лёс і трагедыя наркома нацыянальных спраў Беларусі

(Працяг. Пачатак у №№ 196—199).

«Пасля саедзінення беларуска-літоўскага князя з польскай каралевай,—працягвае Фабіян Гіляравіч,— урад польскі адразу пачаў сваю палітыку над паланізацыяй беларуска-літоўскага народу. Пуцінай подкупаў, надання прывілеяў вышайшаму класу, каланізацыі, насаджэння Іезуіцтва і ў рэшце — прымусаў польская палітыка дабілася таго, што праз сотню з чымсь гадоў увесь высшы слой... атдзяліўся ад свайго грунту нізшых класаў, званых у той час чорным, і, пераняўшы польскую мову і культуру, залічыў сябе да польскай нацыянальнасці». Шантыр называе гэта пераваротам. Беларускі народ, у выніку яго, страціў сваіх культурна-нацыянальных важакоў, стаў, паводле выразу аўтара, «простым гледачом свайго палітычнага бяздарожжа і нацыянальнага сіроцтва». (Прэвапіс арыгінала.—А. М.) Замкнёнасць беларусаў перайшла ў доўгі гістарычны сон нацыянальнай несвядомасці. Гэты сон доўжыўся сотні гадоў. Народ спаў, «бо быў адзінокі, не меў кіраўнікоў і абаронцаў свайго духоўна-нацыянальнага быту, каторыя пабудзілі б яго са сна несвядомасці і ўвялі ў панства свету і пашаны свайго прыроднага чалавечага імяні». Гэта, зазначае Шантыр, быў сон, але не смерць...

А што ж інтэлігенцыя, вышэйшыя класы беларускай нацыі? «Адрокшыся ад сваёй народнасці і прыняўшы польскую мову і павярхоўны лоск польскай культуры, яны праз увесь час чулі сябе чужымі польскай народнасці, бо ў іх гаварыў уласны нацыянальны інстынкт, каторы ніякімі прывілеямі не можна заглушыць»,— перакананы аўтар. Так працягвалася да падзелу Польшчы. Наш край перайшоў пад уладу Расіі, але, робіць вывад Шантыр, «палітыка расейская ніколі не кіравалася пры заборы нашага краю жаданнем «освободить угнетенных братьев от польского ига», як то тлумачылі расейскія гісторыкі, а толькі імперыялістычнымі мэтамі».

«Паліцэйска-русіфікатарскай» называе Фабіян Гіляравіч палітыку Расіі ў нашым краі пасля паўстання 1863 года. Беларускі народ, паводле яго цвёрдага перакананння, «папаў з агня ды ў полымя». «Палякі,— піша ён,— называлі нашу мову «простаю», расейцы ж называлі яе «искусственной смесью польской и русской речи», забыўшы тое, што наша мова пры Іване Грозным дала ім першае пісьменства і праблескі прасветы».

Наш народ — і Фабіян Шантыр як шчыры і сумленны беларус ганарыцца гэтым — увесь час заставаўся сам сабой, не адракаючыся ад свайго ўласнага імя. Беларус зваў сябе «тутэйшым». «Тутэйшы», — тлумачыць ён, — гэта значыць, што ён не паляк, не расеец, не ўкраінец, а сын сваіх родных палёў, лясоў, вёсак, мястэчак, сын таго народу, каторы гаворыць «простай», «тутэйшай» мовай, сын усяго таго, што дало грунт яго псіхічнаму разуменню, на каторым яно ўзрасло...»

Узнёсла адгукаецца Шантыр і аб сваёй роднай мове: «Беларуская мова. Зразумелая, ясная, поўная пекнаты і харастра родная мова. А сколькі пагарды і пляўкоў яна на сабе вынесла не толькі ад чужынцаў, але нават і ад тых здрайцаў і дэгенератаў беларускага народу, каторых маткі саміх выгадавалі ў гэтай мове (як актуальна гучыць гэта заўвага яшчэ і сёння!—А. М.). І якіх толькі нападкаў, якіх толькі плётак яна на сабе не вынесла! Як ёй толькі не капалі і паланізатары, і русіфікатары магілу, а яна ўсё жывая, усё па-даўнейшаму злучвае дзесяцімільённы беларускі народ». Даследчык пераконвае чытача ў нацыянальнай самабытнасці і індывідуальнасці нашай мовы, якая ва ўсе часы раздзяляла долю і лёс народа. Шантыр верыць, што і яна, «прыбраная ў светлую апратку, зойме пачотнае месца ў сям'і славянскіх моў». І яшчэ: «У аснове сваёй наша мова мае столькі чароўнай прастаты і харастра, што не пройдзе і колькі дзесяткаў год, як яна не толькі зраўнуецца з другімі цывілізаванымі мовамі, але пакажа і тую містычную глыб беларускага народу, якая дасюль не зразумета ў Міцкевічу і Дастаеўскім» (падкрэслена мной—А. М.) Бліскучая думка, не развітая і не разгаданая даследчыкамі літаратуры і мовы і да сённяшняга дня.

Беглы погляд-аналіз — але таксама грунтоўны — кідае Шантыр і яшчэ на «адну нацыянальную асобнасць беларуса, гэта яго абычай як праява духоўнай творчасці». «Абычай беларуса», паводле аўтара, у большай ступені выяўляецца ў казцы і песні, «як патрэбе маралі і харастра». «Казка і песня беларуса,— сцвярджае ён,— гэта крытэрыум яго духоўнага быту, гэта яго псіхічна пачуццёвы воблік... Мы не памылімся, калі скажам, што гэта ёсць шлях гістарычных перажыванняў беларускай нацыі, што гэта ёсць няпісаная гісторыя беларускага народу». Фабіяна Гіляравіча захоплівае падзіў, як «народ-невук, народ-сірата, забыты ў панстве свету і культуры, мог так праўдзіва заглыбіцца ў кожную рысу свайго духоўнага зместу... І калі б мы маглі сабраць усю тую мараль, якая рассеяна па казках беларуса, усё тое пачуццё, каторым перапоўнена яго песня,— то перад намі вырысаваўся б аблік чалавека з аграмадным багаццем здаровага сэнсу і глыбінёю найхарашэйшага пачуцця, але і столькі ж бяздольны, і столькі ж гаротны...»

Шантыр робіць вывад: найважнейшыя з кардынальных асаблівасцей беларускай нацыі даюць ёй права ісці ў гісторыю ўласным шляхам, «не будучы нічым прыслугачом». І як шкада, што гэта мы пачынаем разумець толькі сёння, праз сем з палавінай дзесяцігоддзяў пасля таго, як гэта ўсвядоміў наш славуты (і забыты) папярэднік Яшчэ тады, у 1918-м, ён звяртаўся да пачуццяў і розуму беларусаў: «Калі хоць аднаго з іх мне ўдасца прабудзіць да вялікага гарачага кахання к забытаму абязоленаму краю, пазваць да працы шчырай на нацыянальнай раллі дзеля свету, дзеля лепшай будучыні гаротных братоў,— я буду шчаслівы...»

Такі ж аб'ектыўны, праўдзівы Фабіян Шантыр і ў развагах аб самавызначэнні народа.

«Самаадзначэнне кожнага народу,— піша ён,— не толькі карысна для яго аднаго, бо вядзе яго па праўдзівай дарозе цывілізацыі, культуры і дабрабыту ўсяго чалавецтва, але таксама карысна і для ўсіх народаў, бо сваім жыццём — не чынячы ніякіх перашкод на дарозе росту чалавечага духа, здабыцця эканамічных багацяў і паляпшэння сацыяльных варункаў жыцця — прыбліжае ў сваёй частцы ўсё чалавецтва да вялікіх ідэалаў волі, брацтва, кахання».

Даследчык справядлівы і катэгарычны і тут: «Не адзін народ не стаіць на такім страшным бездарожжы нацыянальна-духоўнага жыцця і палітычнага бяспраўя, як мы, беларусы. Сотні год наш увесь бяздольны народ без свету, без свайго чалавечага імені бродзіць у цемры нацыянальнай несвядомасці, а дзеля гэтага служыць толькі афёрай здзеку і пагарды... Не будучы свядомым свайго нацыянальнага імені, не карыстаючыся з сваіх творчых дароў натуры ў святле ўласнай сваёй душы, ён не можа выйсці на дарогу праўдзівага поступу да культуры, не можа ісці ў поруч з другімі нацыямі да агулова чалавечых ідэалаў, а стаіць адзінокі, сіратлівы, адгарожаны кітайскаю сцяною ад цывілізацыі, не могучы даць тых вялікіх скарбаў духа, якія носіць у сабе».

І сапраўды, ён меў рацыю. Праз чужую мову, культуру, праз іншую свядомасць ніводзін народ не можа прыйсці да агульначалавечых каштоўнасцей і ідэалаў раўнапраўным членам. Да раўнапраўя, да беларускага нацыянальнага самавызначэння ён і заклікаў у сваёй працы. Шантыр бачыў і разумеў: беларускай нацыі ў той час як ніколі раней патрэбны былі асвета і культура. Толькі яны маглі даць беларусам магчымасць «надняцца з вяковай пропасці», толькі яны з «беларуса — пакорнага слугі ўсіх — зробяць раўнапраўнага грамадзяніна, ...уваскрэсяць яго да творчай гасударственнай працы пад уласным нацыянальным сцягам; яны заставяць другія народы паважаць імя беларуса...» А для гэтага, перакананы аўтар, «цяпер як ніколі павінны прыйсці да яго лепшыя сыны, каторых ён ускармій, узрасціў і даў можнасць у свеце распазнаваць харастро і цемру, праўду і крыўду,— павінны прыйсці правадырамі і правесці свой народ да нацыянальнага самаадзначэння... Толькі цяпер, у час смерці і васкрашэння, каб наш народ ізноў не астаўся на доўгія гады нявольнікам і афёрай здзеку, мы павінны разбудзіць яго са сну несвядомасці да разумнага нацыянальнага быту, будовы сваёй бацькаўшчыны на падставе нашай народнасці і жадання народа. Пакуль наш народ не будзе разбуджаны са сну нацыянальнай несвядомасці, пакуль ён не стане зусім свядомым свайго «я», свайго ўласнага імені, пашаны сваёй чалавечай годнасці, пакуль яго розум і дух не стануць на моцнай нацыянальнай падставе, не дасягнуць мэты развіцця, і пакуль будзе ўсё яшчэ пагарджаным слугою другіх, мы, святлейшыя яго дзеці, павінны працаваць і працаваць не пакладаючы рук...»

Ён не толькі звяртаецца да іншых, «святлейшых дзяцей» беларускага народа, але і цяпроза ўсведамляе сваю асабістую адказнасць. «Як мы павінны быць гордыя тым,—заканчвае Шантыр свой твор,— што гісторыя на нас ускладае гэту вялікую і святую працу».

Жаданне свабоды ў нашага народа, на думку Фабіяна Гіляравіча, было вялікае. Аднак, лічыў ён, шырокія масы слаба верылі ў тое, што дасягненне гэтай свабоды магчыма. І Шантыр вырашае дзейнічаць больш актыўна... Працуючы над кніжкай «Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і самаадзначэння народу», ён ставіў сваімі задачамі ажывіць у народа актыўныя, стваральныя сілы, здольныя пабудаваць беларускую дзяржаўнасць, захаваць і адстаяць яе, высветліць і ўказаць аб'ектыўныя напрамкі, якія будуць як спрыяць, так і перашкаджаць гэтаму творчаму працэсу.

Кніжка «Патрэбнасць нацыянальнага жыцця...» была прыхільна сустрэта грамадскасцю. Яе невялікі тыраж даволі хутка разышоўся па руках, яна абмяркоўвалася тымі, хто меў да праблем беларускага адраджэння хоць бы невялікі інтарэс.

У № 19 за 12 ліпеня 1918 года рэцэнзію на твор апублікавала газета «Дзянніца». Хтосьці невядомы, падпісаўшыся псеўданімам «Чытак», паведамляў чытачам:

«...Ф. Шантыр выпусціў у свет сваю невялічкую кніжачку, у якой ён паднімае і разглядае досыць цікавае не толькі для кожнага беларуса, а і ўсіх тых, хто цікавіцца жыццём, але становячым дужа важкім, беларускім пытаннем. Накідаўшы кароткі абрыс гістарычнага становішча беларускага народу і крануўшы тое месца, якое ён займаў у барацьбе з суседзямі, аўтар пераходзіць да выявы тых асабістасцяў беларуса, якія ўжыты ў ім, як у прадстаўніку асобнай, саматворачай нацыі, якую ў сваіх інтарэсах, з аднаго боку польскія паны і клерыкалы, з другога — расійскія чыноўнікі, а пад іх нірункам і буржуйныя гісторыкі, стараліся наперакор законам жыцця звясці яго з арэны, пахаваць, утапіўшы ці ў польскім, ці ў расейскім моры...»

Рэцэнзент найперш адзначае «досыць крэпкі фундамент» даследавання. Пазнаёміўшыся з ім, ён прыходзіць да высновы, што ўдала выяўленыя Шантырам асаблівасці нашага народа і сапраўды «вымушаюць беларусаў на заваёву сабе правоў на самаадзначэнне, як народу, поміж з другімі, роўнымі яму». Не абыходзіць «Чытак» і недахопы выдання: на яго думку, «аўтар надта закрапаў сваю, добра ім знаную, беларускую мову загранічнымі славамі, якія робяць цяжкім чытанне...» Заўважыў ён і мноства памылак друку, «рознасць вялічыняў літараў», што робіць «непрыемны выгляд». Рэцэнзент, аднак, ведае, што гэта — «прычыны тых варункаў, у якіх прыходзілася друкаваць кніжку». Несумненна, што рэцэнзент — чалавек, які добра ведаў Фабіяна асабіста, не выключана, што гэта мог быць і сам рэдактар «Дзянніцы» Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны)...

Удзел у рабоце Усебеларускага з'езда і выступленне на ім, выданне кніжкі — хоць і невялікай, але талковай і ёмістай па думках, рэцэнзія на яе ў «Дзянніцы» — усё гэта прынесла Фабіяну Гіляравічу шырокую вядомасць як глыбокаму і ўдумліваму спецыялісту па нацыянальных пытаннях. І не выкарыстаць ягоныя веды, вопыт, гэтаксама, як і ўменне працаваць з людзьмі, было ў той час проста несправядліва.

...Напачатку 1918 года пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей, які ўзначальваў І. Сталін, у адпаведнасці з дэкрэтам У. Леніна быў утвораны Камісарыят па справах беларусаў. На пост камісара Белнацкома Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя прапанавала Аляксандра Чарвякова, яго памочнікам — Уладзіслава Скарынку. Беларуская сацыялістычная грамада са свайго боку вылучыла на пасаду галоўнага сакратара камісарыята Зміцера Жылуновіча.

Арганізацыйная структура, формы і метады дзейнасці Белнацкома прыстасоўваліся да правядзення палітычнай, культурна-асветнай і арганізацыйнай работы сярод працоўных розных нацыянальнасцей. Аднак гэта работа моцна ўскладнялася тагачаснай сітуацыяй у Беларусі. Асноўная частка насельніцтва яе знаходзілася на акупіраванай немцамі тэрыторыі, а незанятымі ворагамі былі толькі паветы ўсходніх частак Віцебскай і Магілёўскай губерняў.

(Працяг будзе).

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў да друку Мікалай ЧАХОЎСКІ (тэл. 32-41-92).

ВАШ САД І АГАРОД

РЭКОРДЫ ПРЫСЯДЗІБЫ

Гарбуз з-пад Пухавіч

Мы працягваем атрымліваць больш-менш важкія экземпляры прадукцыі, якая вырасла на агародах. Гэты гарбуз — з вёскі Зазерка Пухавіцкага раёна. Важыць 6,133 кілаграма. Гадаваўся разам з бульбай. Як мы рэкамендавалі, над другой завязззю асноўная плець была адрэзана. Другі гарбуз аказаўся некалькі меншым.

На працягу ўсяго дня над полем свяціла сонца. Ніякіх асаблівых мерапрыемстваў не праводзілася. Расада высаджвалася на пастаяннае месца, калі мінула небяспека маразоў, — 28 мая. У ямкі паклалі перагной (дзве рыдлёўкі), па жмені попелу і суперфасфату. Летам былі дзве падкормкі: першая, калі пачалі расці плеці (каравяк у звычайных дозах), другая — пасля завязвання двух гарбузоў (птушыны памёт зноў у звычайных дозах, з дабаўленнем на вядро шклянкі попелу, сталовай лыжкі сернакіслага калію і 3 грамаў буры). У час першай падкормкі пад кожны куст далі 2 літры, у час другой — тры літры. Падкормкам папярэднічалі паливы. А ўвогуле паливаў у засушлівае лета было пяць.



Саджанцы з... лесу

Надышла пара абзавесціся ўласным садам, калі яго яшчэ няма. Цэны на ўсіх базарах рэспублікі — аж дух займае. У Мінску на Камароўцы яблынька «цягне» на 140—170 рублёў, вельмі дарагія парэчкі — да сарака. Нават маліна прадаецца па дзесятцы. Такога раней не было.

Прапануем садаводам самім выгадаваць дрэўцы. У час паходу па грыбы абазначце, дзе растуць яблынькі-дзічкі і грушы. Дыяметр іх стволіка — ад 0,5 да 3 сантыметраў. Штамбікі павінны быць без пашкоджанняў (іх трэба пільна агледзець).

У лістападзе (бліжэй да марозных дзён) выкапаем дрэўцы, імкнучыся як найменш пашкодзіць каранёвую сістэму. Усе дрэнныя і паламаныя карані адразаем. Знімем лісцікі, калі яны яшчэ засталіся. Дрэўцы пакінем на зіму прыкапанымі, добра паліўшы. Прымем меры, каб зберагчы ад грызуноў.

Зімой нарыхтуем чаранкі патрэбных сартоў, закапаем у снег. Можна набыць гэтыя чаранкі і вясною, калі дрэвы яшчэ не кануліся ў рост. Але ёсць небяспека атрымаць падмарожаны тавар.

Вясною адкопваем свае дрэўцы і прышчапляем патрэбны сорт. Садзім у спецыяльнае месца — нешта накшталт гадавальніка. Год ці два саджанцы растуць там, набіраюць моцы. Потым перасаджваем іх на пастаяннае месца.

Гэтак жа можна гадаваць іграшу, вішню, сліву, алычу, іншыя культуры.

Каліна дорыць здароўе

У лясах і зараснiках ля рэк і ручаёў, на дачных участках яркай чырванню ўспыхнула каліна. Памятаеце ў песні: «Каліна чырвоная, каліна выспела...»...

Лёгкія вераснёўскія маразы нібы падштурхнулі гэту расліну паспяшацца з аддачай. Два тыдні назад ягады яе былі яшчэ зусім непрывабнымі. А цяпер сакавітыя, буйныя, налітыя.

Яшчэ з гарчынкай, але ўжо ўмеранай. Так што бярыце ёмістасці і нарыхтоўвайце ягаду. Яны дапамогуць перамагчы прастуду, кашаль, палепшаць работу сэрца, ажывяць кроў.

Можна зразаць цэлыя чырвоныя гронкі і падвешваць пад страхой для набыцця найбольшага эфекту. Каліну варыць, дадаюць для купажыравання ў іншыя нарыхтоўкі. З яе вельмі добрае віно.

Перабяром ягады, выкінуўшы смецце і сапсаваныя. Памыем у дзвюх водах. Затым акунём на 3 мінуты ў кіпень і адразу — на друшляк.

З апрацаваных такім чынам ягад рознымі спосабамі (прэс, сокавыціскалка, сакаварка) здабываем лячэбны сок. Жмых, які застаўся, таксама не выкідваем. Яго заліваем кіпенем (0,5 літра вады на літр адходаў) і вытрымліваем да сутак. Праз марлю яшчэ раз адціснем. Здабытую вадкасць уліваем у сок, які атрымалі раней. Дадаём цукар і ставім на агонь. Даводзім да 80—90 градусаў і разліваем у падрыхтаваныя слоікі, закупорваем. Такі прадукт добра ўжываць асобна і ў «кампаніі» з іншымі сокамі — чарнічным, яблычным, слівовым...

Каліна чырвоная вельмі вялікі жыцялюб. Яна не вытрымлівае толькі сухіх глебаў. А размнажаецца насеннем, чаранкамі, адводкамі. Насенне, якое перайшло ў жмых, у час, калі здабывалі сок, якраз можна высяваць на зіму. За доўгі перыяд яно пройдзе неабходны перыяд «дапрызыўнай падрыхтоўкі», а вясной выкіне жвавы жыўчык-парастак. Вы будзеце са сваёй калінай.

Сваё насенне

Вясною мы шмат увагі ўдзялялі індывідуальнаму насенняводству. Бадай, не было такой культуры (выключэнне складаюць хіба што рэдкія), на якой не спынілі б увагу чытача. Зараз надышоў час збору насення. З гэтым не трэба марудзіць, бо дзе-нідзе ласавацца смачным змесцівам насенных «кошычкаў» прынадзіліся птушкі.

Насенныя парасончыкі ці стрэлкі зразаем нажніцамі, звязваем у снопікі і падвешваем на гарышчы для прасушкі. Абавязкова падкладваем плёнку ці паперу, каб «злавіць» першынцаў, якім вельмі карціць пакінуць матчына гняздо. Слабыя начныя замаразкі не пашкодзяць маленькія зярняткі. З надыходам больш халоднай пары (пачатак лістапада) насенне неабходна абмалаціць. Можна пацерці ў руках, пабіць злёгку палачкай, абтрэсці. На слабым ветры правеяць. Буйныя будуць падаць адразу, больш лёгкія адляцяць. А нагол пустыя апынуцца ў агульнай масе смецця. Іх не шукаем.

Абмалочанае насенне змяшчаем у мяшочкі з тонкай тканіны строга па гатунках. Гэтыя мяшочкі падвесім у месцах, дзе блукае вецер, — зярняткі дойдуць да нормы.

Многія захоўваюць насенне ў жалезных ці шкляных ёмістасцях, шчыльна закрываюць, кладуць у шуфлядкі. Рабіць гэтага нельга. У такіх умовах выдатна развіваюцца розныя хваробы, насенне пацее. Калі мяшочкаў па нейкай прычыне няма, можна выкарыстоўваць папяровыя пакеты. Зрэшты, у такіх пакетах мы купляем насенне ў дзяржаўнай «Сортнасенагародніне». Але і пакеты (з надпісанай назвай гатунку) не захоўвайце ў нейкім замкнутым асяроддзі. Уладкуйце ў адкрытых скрынічках (з-пад абутку, напрыклад) у халаднаватым месцы, якое добра праветрываецца, далей ад батарэі ці печак.

Нагадаем, што пры такіх умовах кроп, морква, шчаўе, пятрушка, салата, сельдэрэй, памідоры, перац, цыбуля захоўваюць «баявую гатоўнасць» на працягу 2—3 (можа, крышачку больш або менш) гадоў; агуркі і баклажаны — 4—5. Самы няўстойлівы — пастарнак. Яго насенне можа страціць усходжасць нават праз год.

У любым выпадку насенне праяраюць. Для гэтага 10 каліў прарошчваюць на вільготнай анучы. Калі праз тыдзень (пятрушка і сельдэрэй пазней) калівы не выкінулі белы карэньчык, трэба біць трывогу.

Па групавому паказчыку мяркуюць аб энергіі росту. У любым выпадку ўсе 10 каліў адначасова прарастаюць вельмі рэдка. У морквы, напрыклад, гэта 7 каліў, крыху лепш ідуць справы ў памідораў, буракоў, агуркоў...

НАВІНЫ АКЦЫЯНЕРНАГА ТАВАРЫСТВА «БЕЛАГРАПРАМБІРЖА»

БЕЛАГРАПРАМБІРЖА МЕНСК

ЗА ВЕРАСЕНЬ ЗАРЭГІСТРАВАНЫ 152 РУБЛЕВЫЯ І ВАЛЮТНЫЯ ЗДЗЕЛКІ НА АГУЛЬНУЮ СУМУ 268 МЛН. РУБЛЁЎ. У ІХ ЛІКУ АДНА ЗДЗЕЛКА НА СУМУ 780 ТЫС. ДОЛАРАЎ ЗША.

На таргах у пятніцу, 2 кастрычніка 1992 года, былі зарэгістраваны 33 здзелкі на агульную суму 44,5 млн. рублёў.

НАЙБОЛЬШ БУЙНЫЯ ЗДЗЕЛКІ:

Продаж цукру на 27 млн. рублёў, бульбы — на 7,6 млн. рублёў, збожжа — на 2,7 млн. рублёў, піларам — на 4 млн. руб.

Сярод купленых і прададзеных тавараў:

Назва тавару	Адзінка вымярэння	Цана за адзінку (рублёў)
Акцыя АТ «Белаграпрамбіржа»	шт.	40.000
Жыта «Верасень», 1 рэпр.	тона	18.000
Бульба харчовая «Тэмп»	тона	15.200
Цукар трысняговы	тона	67.000
Рыбін тлушч	тона	50.000
Трактары МТЗ-80 з уніфік. кабінай	шт.	480.000
Трактар Т-40 АМ	шт.	240.000
Аўтамабіль «Масквіч»-21412, 1990	шт.	300.000
Аўтапрычэп ГКБ-8328, новы	шт.	70.000
Фуражыр навясны ФН-1,4	шт.	45.000
Раскідвальнікі МВУ-6	шт.	40.000
Культыватар КЧ-5,1	шт.	4.000
Культыватар-дызель КПЧ-5,4	шт.	8.000
Буртаўкрывальнік БН-100	шт.	7.000
Раскідвальнікі мін. угнаенняў РМГ-4	шт.	43.000
Мотакультыватары «Крот»	шт.	19.500
Падагравальнік мазуту ПМ-25-6	шт.	7.500
Каробкі перамены перадач да камбайна «Ніва»	шт.	10.200
Каробка перамены перадач да камбайна «Дон»	шт.	35.200
Піларамы Р63-5Б	шт.	800.000
Стартэры да аўтамабіляў ГАЗ, УАЗ, ЗІЛ, «Масквіч»	шт.	4.500—5.000
Прыводы да стартэра 230	шт.	200
Пробнікі акумулятаршчыка 307	шт.	760
Кола да аўтамаб. ЗІЛ, КамАЗ, 250×540	шт.	8.200
Шклаблокі	шт.	13
Пяніна «Б-7»	шт.	18.000

ДА ЎВАГІ КІРАЎНІКОЎ КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ, ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ!

Акцыянернае таварыства «БЕЛАРУСКАЯ АГРАПРАМЫСЛОВАЯ БІРЖА» 9, 16, 23 і 30 кастрычніка праводзіць

УПЕРШЫНЮ АСЕННІЯ АДКРЫТЫЯ ТАРГІ.

У ГЭТЫЯ ДНІ ВЫ МОЖАЦЕ АЗНАЕМІЦЦА З работай «Белаграпрамбіржы», а таксама ПРАДАЦЬ НАЯЎНЫЯ Ў ВАС І КУПІЦЬ неабходныя ВАМ ТАВАРЫ.

ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ТАРГАХ І ЗАКЛЮЧЭННЯ ЗДЗЕЛАК неабходна мець КРУГЛУЮ ПЯЧАТКУ гаспадаркі ці прадпрыемства, а таксама ДАВЕРАНАСЦЬ на права ўдзелу ў таргах біржы і заключэння здзелак.

ДАВЕДКІ ПА ТЭЛЕФОНАХ: 77-01-37, 77-07-26.

Таргі праводзяцца ШТОТЫДНЁВА ПА ПЯТНІЦАХ, з 11 гадзін па адрасу: г. Мінск, вул. Казінца, д. 86, корпус 2.

РЭГІСТРАЦЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ з 9.00 гадзін.

АЛІМПІЙСКІ БАЛЬ

у гонар 40-годдзя ўдзелу спартсменаў Беларусі ў Алімпійскіх гульнях

11 СНЕЖНЯ 1992 ГОДА

BELARUS

ПАЛАЦ СПОРТУ

Кіраўнікі прадпрыемстваў і бізнесмены!

ДЛЯ ВАС ГЭТА ВЫГАДНАЯ МАГЧЫМАСЦЬ данесці рэкламу сваёй прадукцыі да спажыўца.

ДА ВАШЫХ ПАСЛУГ:

- шчытавая рэклама;
- тэлевізійная рэклама ў час прамой трансляцыі;
- удзел непасрэдна ў праграме балю.

Каардынатары рэкламы чакаюць вашых прапаноў.

Тэл. у Мінску: 27-43-72, 27-89-66.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

8 кастрычніка

Беларускае тэлебачанне

8.45. Экран беларускага кіно. «Двое на востраве слёз».
10.15. «Пяць зорак». Тэлегульня.
16.30. Навіны.
16.35. Беларуская літаратура. 11-ы клас.
17.05. Мультфільмы.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.45. Валожынскія баклажаны. Тэленарыс пра фермера Л. У. Радына з вёскі Рудня.
20.10. Тыдзень беларускага ўрада. Інтэрв'ю старшыні Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў, народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь Д. К. Арцымені. Перадача з Гродна.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Студыя «КіТ».
23.25. Ніка.

Канал «Астанкіна»

5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. «Жывая вада». Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.30. Урачыстае набажэнства, прысвечанае памяці прападобнага Сергія, ігумена Раданежскага і Усяе Русі цудатворца. Трансляцыя з Троіцка-Сергіевай лаўры. У перапынку (11.00) — навіны (з сурдаперакладам).
12.35. «Станцыйны наглядчык». Маст. фільм.
13.40. «Сцежка для дваіх».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Тэлемікст.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. «Калтукскія бабулькі».
16.40. «КРІК: культура, расследаванні і каментарыі».
17.00. Навіны.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. «Вагон-03». Перадача 3-я.
18.30. «Багатыя таксама плачуць».
19.15. Максіма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато «Мільён».
21.10. Да 100-годдзя з дня нараджэння М. Цвятаевай. «Чаг вучнёўства».
21.50. Ваеннае рэвю.
22.15. У гасцях у Мусліма Магамаева.
23.00. Навіны.
23.25. «Кіно, да запатрабавання».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Карысць. Бізнес і палітыка.
8.50. Хрысціянская праграма. «Перад лікам Госпада».
9.20. XX стагоддзе ў кадры і за кадрам. А. А. Ханжонкаў. Частка 1-я.
10.20. Дом сяброў.
10.50. Залатая шпора.
11.20. Вольны час «ТВ-атэлье».
11.35. «Санта-Барбара».
12.25. Мульці-пульці.
12.35. Т.Ін.Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. «Вучыцца рынку».
15.30. Пілігрым.
16.15. Там-там навіны.
16.30. Сергій Раданежскі. «Куліковская бітва».
17.00. Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з НАТО.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Тэатральны раз'езд. «Гора розуму».
18.45. Свята кожны дзень.
18.55. Рэклама.
19.00. Весткі.
19.20. «Санта-Барбара».
20.10. У свеце аўта і мотаспорту.
20.40. Давайце разбяромся.
20.50. Спецыяльны намерцыйны веснік.
21.00. Айчына мая.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.00. На сесіі ВС Расіі.
23.30. Музычны ансамбль «Клясіка».

НА ДВОР'Е

7 кастрычніка

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае надвор'е, на большай частцы тэрыторыі — дажджы. Тэмпература паветра ў Віцебску, — 9—11, Магілёве, Гродна — 10—12, Мінску — 11—13, Брэсце, Гомелі — 13—15 градусаў цяпла.

У наступныя дзве сутак па рэспубліцы часам дажджы, парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы 8-га — 1—6, 9-га — 4—9, удзень — 9—14 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

Праўленне Беларускага фонду культуры глыбока смутнуе з нагоды заўчаснай смерці члена прэзідыума фонду культуры, акадэміка Акадэміі навук РБ Мікалая Васільевіча БІРЫЛЫ і выказвае шчырыя спачуванні родным нябожчыка.

САЮЗ МАЛЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

◆ РАСПРАЦОЎВАЕ ўстаноўчыя дакументы і АКАЗВАЕ ПАСЛУГІ па рэгістрацыі і перарэгістрацыі прадпрыемстваў любых форм і відаў, уключаючы прыватныя, сямейныя і дзяржаўныя, арэндныя і калектыўныя прадпрыемствы, таварыствы з абмежаванай адказнасцю і акцыянерныя таварыствы, сумесныя прадпрыемствы і прадпрыемствы са 100-працэнтнага замежнага капіталу.

◆ ЗАБЯСПЕЧВАЕЦЦА МАТАРЫЯЛЬНАЕ ЗАСВЕДЧВАННЕ дакументаў, АДКРЫЦЦЁ рублёвага і валютнага рахункаў, АКАЗВАЕЦЦА САДЗЕЙНІЧАННЕ ў вырабе пячаткі.

◆ ПРАДСТАВІЦЬ ВАШЫ ІНТАРЭСЫ ў судзе і гаспадарчым судзе, ДАПАМОЖА ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ вас у якасці ўдзельніка знешнеэканамічных сувязей.

НАШ АДРАС: 220010, Г. МІНСК, ВУЛ. БЕРСАНА, 1, ПАКОЙ 308

(пл. Незалежнасці, НДІ эканомікі Дзяржэканомплана).

ТЭЛЕФОН: 20-93-41.

РАБОТА З НАВЕДВАЛЬНІКАМІ З 12.00.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Тыраж 81.098. Індэкс 63.850. Зак. № 200. Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 21.00.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12